Тамаш Ліпаман ☞ 9

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Беларускі гурток у Варшаве ☞ I

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 30 (2724) Год LIII | Беласток, 27 ліпеня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Сцяг мой вольны сцяг мой смелы сцяг мой бел-чырвона-белы

Фота Міры ЛУКШЫ

Міра ЛУКША

Вось чарговы Фестываль музыкі маладой Беларусі. Тысячы аматараў песні прыбылі ва ўрочышча Барык на ўскраіне Кнышынскай пучшы, што паміж Валіламі і Гарадком — у значнай частцы маладыя людзі ва ўзросце дзяцей тых, хто пачынаў „Басовішча". Для „мастадонтаў", якія ўсё ж лічаць сябе нестарымі і маладымі духам, гэта таксама нагода сустрэцца, пабачыць знаёмых. Не будзем тут успамінаць пра густы — аднаму даспадобы густы ды цяжкі рок, дзе са сцэны сярод ломату не разбярэшся слоў, іншаму хочацца пачуць моцны тэкст, не слабейшы ад музыкі, як у „Нейра Дзюбеля", каму марыцца яшчэ раз паслухаць, як на першым фестывалі, барда ці падфолькавую „Грамаду"! Са сцэны прагучаць час ад часу словы былых гасцей фестывалю, якіх нават і няма ў жывых, хоць бы Анатоля Сыса. Адно вядома, ніхто сюды не прыехаў па папсу. З Беларусі едзе моладзь са сцягамі — знакам тых, хто змагаецца за сваё слова і свабоду праяўлянння сябе. „Басовішча", якое існуе незалежна ад клопатаў, гэта таксама знак, відны знак для тых, каму недаспадобы той сцяг, той малады бунт.

— Поют какую-то х...ю! — чую ззаду, з лавачак пад сцэнай, у момант, калі на сцэне выступае спявак Змітро Вайцюшкевіч. Вайцюшкевіч, вядомы ў Польшчы, якраз вярнуўся з еўрапейскіх гастроляў і цешыцца сваімі ўражаннямі з барыкоўскай публікай: „Я кахаю Францыю!" Гэта ж і як „я кахаю Еўропу!", свабоду, французскі шарм і лёгкасць, музыку, жанчын, вясну! Што хочаш! Мае на гэта права і спявак, мае права на свой выбар публіка „Басовішча", якая кахае халоднае піва ў спёку і гарачую смажаніну ў голад пасля танцаў. Якой моцна на падабацца тое, што ахоўнікі адымаюць ад яе сцягі на палках, якія „раптам могуць выкалаць вока іншым танцуючым". „Нас пад гэтымі сцягамі білі!" — заяўлялі гнеўна ўдзельнікі з Беларусі. А мы ж на тое на Беласточчыне прыдумалі і рабілі гэты фестываль, каб гэтыя лунаючыя над сцэнай сцягі ўсіх радавалі! І васемнаццаць гадоў нікому гэта не перашкаджала, а цяпер „белсатаўцам" мяшаюць яны

Фота Хрыстафора Ангельчыка

фільмаваць мерапрыемства, быццам засланяючы сцэну! Моманты атакі ахоўнікаў, ламаючых тронкі ад сцягоў, нагадвалі сцэны з лукашэнкаўскага Мінска. Сябры-арганізатары, не ўсё трэба рабіць пад дыктоўку медыяў! І не тлумачце гэтага законамі, на якія ў мінулым не звярталася ўвагі і якія нікому не перашкаджалі. На штосьці падобнае ў будучым нашай згоды не будзе! Маладыя людзі, ахутаныя ў сцягі, на руках стужачкі, са значкамі, а тыя сцягі ў іх — як крылы. Яны сюды прыехалі быць разам і слухаць сваё. Маюць на гэта права тут, у Польшчы, сярод іншых, хто думае таксама. Бо мусіць „Жыць Беларусь!" Іншы скажа: „А мяне не цікавіць палітыка! Мне музыку давай! Танцы!" Маюць людзі права на ўсё, абы не крыўдзілі нікога!

Цяпер візы цяжка было атрымаць, дык не ўсе гурты змаглі прыехаць! Ды былі такія, хто не меў праблем з візай. Мабыць, і гэты, што крычыць пра „х...ню" на сцэне, бо не па такое сюды ў Польшчу прыехаў. Найпрыгажэй, мабыць, на яго думку апрануты францік з усіх „басавішчан" — у фірме ад ботаў, праз куртачку да адмысловай шапачкі. Мае на гэта права — лічыць г...ном песню ў выкананні барда на словы пакойнага аўтара. Мае роздумы пра несумненную ідэйнасць гэтага фестывалю спыняе пякучая думка пра яго як зборышча ўсялякага зброду. Станаўлюся перад маладзёнам, гатовая тое ягонае выказванне ўвапхнуць яму назад у рот. Рытарычна пытаюся, чаго ён сюды прыехаў. „Отстань, дура!" — і пасылаецца мяне неадназначная фігура з пальцаў куды мне пайсці. І шмат слоў на абшчэпанятнай мове, якую так укахаў прэзідэнт суседняй нам рэспублікі. Магу толькі скінуць яму тую шапачку — вось такі мой важкі жэст старое „басавічкі", ха-ха! Вядомы ўсім вядучы імпрэзу і спявак Памідораў злуецца на мяне, спачатку па-польску: „А ты чаго хочаш? Прыязджае на „Басовішча" хто хоча. Я ж не кожнага ўпільную! Тут у карчах вакол Барыку не аднаму ў морду надавалі. Я для „пусцяка" не буду зрываць такога мерапрыемства!"

Яшчэ адно глупства нас, старых „басякоў" сустрэла. Перад ад'ездам, на другі дзень, на нашу каляжанку напала „тутэйшая" дзеўка: *Co się do mnie tak odzywasz?! Normalnie mówić nie umiesz? Robicie w tej swojej „Niwie" ch...niu. Co mi wmawiasz? Spier... do Łukaszenki!* Пайшла ў рух адмыслова гакнутая ў слуп бутэлька з-пад піва. Ратуючы сяброўку ад ашалелай беластаччанкі я разрадзіла свой боль і гнеў дачкі белавежскага дрывасека.

ПРАГРАМА VI Белавежскіх мастацкіх інтэграцый — „Ператоча 2008"

25 ЛІПЕНЯ — ПЯТНІЦА

гадз. 18.00 — „Ператоча запрашае" — прагулка калектываў на брычках па Белавежы

гадз. 19.00 — Канцэрт сігнальшчыкаў і адкрыццё „Ператоча 2008"

Выступаюць:

— Фольк-гурт „Даўтэніс"

— Рускі фальклорны калектыў „Рабіна"

— Калектыў народнага танца „Быстры"

— Літоўскі фольк-гурт „Сутарас"

— Беларускі гурт „Прымакі"

26 ЛІПЕНЯ — СУБОТА

гадз. 18.00 — „Ператоча запрашае" — прагулка калектываў на брычках па Белавежы

гадз. 19.00 — Канцэрт сігнальшчыкаў

Выступаюць:

— Беларускі вакальны калектыў „Гармонія"

— Татарскі калектыў „Бунчук"

— Калектыў нямецкай меншасці „Шыдлавянкі"

— Калектыў „КлезмаФоур"

— Цыганскі музычны тэатр „Тэрно"

СЯБРОЎСКАЯ БЯСЕДА

Войт Гарадоцкай гміны і Гмінны цэнтр культуры ў Гарадку сардэчна запрашаюць на мерапрыемства

„Сяброўская бяседа — інтэграцыя нацыянальных меншасцей — культурныя сустрэчы".

Мерапрыемства адбудзецца 26 ліпеня 2008 года. Месца сустрэч — урочышча Барык у Гарадку, пачатак — у 17⁰⁰. У праграме „Сяброўскай бяседы" — канцэрты польскіх, беларускіх і ўкраінскіх калектываў, конкурсы, латкі з рэгіянальнымі вырабамі, паказ феерверкаў, народнае гулянне і шмат іншых атракцыёнаў.

Мерапрыемства ладзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

З сумам і горыччу паведамляем, што Таварыства беларускай культуры ў Літве панясло вялікую і непапраўную страту. Вечарам 19 ліпеня на Мядзельшчыне ў Беларусі трагічна загінуў намеснік старшыні ТБК

ВАЛЕР МІСЮК

Лепшаму сябру нашага Таварыства споўніўся 31 год. На працягу дзесяці гадоў магістр Валер Місюк быў узорам парадачнасці, сумленнасці і беларускасці.

Рада ТБК Літвы

9 770546 196000

Эсэ пра лепшых

Беларусы ўжо даўно паказалі, што яны маюць права на сваю ідэнтычнасць. Гэта сапраўды унікальны народ, аналагаў якому няма на свеце. Таму і мае права называцца народам. Нават у абсурднасці паводзін мы непаўторныя. Параўнаць хаця б дзве трагедыі. Некалі на Нямізе штосьці святкавалі. Пайшоў дождж. Ад яго так уцякалі, што падушылі людзей. А вось як грымнуў выбух падчас святкавання Дня незалежнасці — працягвалі танцаваць ды весяліцца. Дажджу баімся, а выбухаў не. Дзе яшчэ такое можна ўбачыць. Загадкавая ў нас натура.

Але гэтыя абсурдныя паводзіны не самы вялікі паказчык нашай унікальнасці. Здаецца, нідзе ў свеце людзі так моцна не хочуць выглядаць лепшымі ў вачах бліжняга, як тут. Абслуга кіраўніка дзяржавы сцвярджае, што такога добрага начальніка няма нідзе на свеце. Той у сваю чаргу кажа, што ў нас абраны найлепшы шлях унікальнага развіцця. Увесь народ верыць, што мы найбольш адукаваная і самая начытаная нацыя. І нават апазіцыя, якая з папярэднімі тэзісамі нібыта нязгодная, б'ецца ва ўнутрывідавой агоніі, каб паказаць адзін другому сваю лепшасць. Прычым „лепшыя" стараюцца быць лепшымі не наогул, а перад бліжнім.

Прыкладам, той выбарчы працэс у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, які ўжо стартануў. Паўсюдна ў свеце апазіцыя змагаецца з уладай. У нас жа ўсе палітычныя плыні заявілі, што на гэтых выбарах уладу перамагчы не ўдасца. Прычыны зразумелыя, але ж з некім змагацца за права быць лепшым усё адно трэба. Аднак, пачалі змагацца паміж сабой. Хто мае сілы паказаць сябе на выбарах, што ён нечага варты, сабраць хаця б тысячу подпісаў выбаршчыкаў, тым і ганарыцца. Маўляў, лепшы за іншых, хоць пра перамогу і змену сітуацыі няма і гаворкі. Хто гэтага зрабіць не ў змозе і можа сабраць толькі ініцыятыўную групу, той стварае свае асяродкі, ганьбіць першых і сцвярджае тое самае. Маўляў, лепшыя мы, толькі не збіраемся гуляць у тыя гульні па правілах улады. Хто і гэтага зрабіць не ў змозе, сцвярджае, што працуе на будучыя прэзідэнцкія выбары, а гэтыя яго не цікавяць. Ну, а няздольныя і на гэта завяраюць, што яны могуць зрабіць усё, таму могуць дазволіць сабе ўсё байкатаваць. Унутрывідавая барацьба за назву лепшага дасягнула свайго апагея і зайшла так далёка ў сваёй абсурднасці, што паказаць свайго сапраўды лепшага, які ўзначаліць краіну ў хуткім будучым, практычна ніхто не можа.

А найцікавейшую пазіцыю займаюць тыя, хто не хоча, або няздольны, ці проста баіцца штосьці рабіць. Сваю бяздзейнасць яны так моцна ўвялі ў ранг вышэйшай ідэалогіі, што на першы погляд здаюцца самымі разумнымі. З вельмі мужнымі тварамі яны сцвярджаюць, што не збіраюцца нечага там рабіць прынцыпова. Спасылаюцца пераважна на тое, што іх штодзённая дзейнасць настолькі важная і важкая, што прынясе большы плён, чым удзел у выбарах і байкотах усіх разам узятых апанентаў.

Можа яно так не толькі ў нас. Закон „бі сваіх — будуць баяцца чужыя" існаваў заўсёды і ўсюды. І нават такія агульнанацыянальныя фразы як „загадкавая расійская душа" ці „вялікая амерыканская мара" разбіваліся менавіта аб суседа, а не аб нейкага знешняга бязлітаснага ворага. Бо калі такі вораг з'яўляўся, то неяк людзі гуртаваліся і баранілі адзін аднаго. А як знікаў, то адразу пачыналі дубасіць таго, на чыё плячо можна было разлічваць зусім нядаўна. І ўжо хацелася паказаць лепшай не сваю супольнасць, а сябе самога. А мы, беларусы, здаецца ў гэтым кірунку наперадзе ўсёй планеты.

Ну, ніхто не хоча прызнаць, што лепшы не ён. Пачынаючы ад удзелу ў бессэнсоўных выбарах, ці ў іх бессэнсоўным байкоце і заканчваючы бессэнсоўным бяздзеяннем. І ўсёй гэтай бессэнсоўшчыне надаецца неверагодна вялікі сэнс.

Яно то на першы погляд і нічога страшнага, што людзі канкуруюць за тытул лепшага, не разумеючы, што гэта ўсяго толькі праявы комплексу ўласнай непаўнацэннасці. Бяда, што ўсіх іншых шчыра лічаць горшымі за сябе. І канкуруюць не лепшымі метадамі.

А больш за ўсё крыўдна за дзяржаву. Бо ў гэтай гонцы сталі забывацца, што ў нашай адраджэнскай справе сапраўды лепшы той, хто хоча лепшай паказаць сваю краіну, а не толькі сябе любімага. І яшчэ тое, што лепшае — вораг добрага.

Віктар САЗОНАЎ

Побач маралі

Прыгожы адыход, гожая смерць выпала на долю Ганны Арэндт. Пажылая пані памерла раптам з цыгаркай у вуснах, у фатэлі ва ўласным доме, размаўляючы з сябрамі. Некалькі дзён раней кончыла пісаць чарговую кнігу. Ідэю чарговай Вышэйшая воля не дазволіла ёй зрэалізаваць.

Жывуць паміж намі прыгожыя, цудоўныя старцы і хачу верыць у тое, што там, дзе расквітае павага для старасці, там грамадскасць мае шанц пратрымацца. Гэта блізкае пачуццю традыцыі, падставы класіцызму, як памяці аб каранях нашай эпохі, хоць традыцыя гэтая ў прынцыпе фальшуецца ў творах гісторыкаў, прыхарошваецца, дастасоўваецца да мэт блага разуметай грамадскай ці нацыянальнай педагогікі, а ўсё гэта мае забяспечваць прыхамаці ўладных каманд, эліт палітыкаў і, на жаль, людзей культуры, літаратуры, мастацтва.

Відаць, старасць прыдатная хоць бы таму, каб выправіць памылкі маладосці, напрыклад, маладых камуністаў ці нават авантурыстаў, перапоўненых напыхлівасцю, усёведных, абсалютна ўпэўненых у тым як выправіць наш недасканалы свет, а ў выніку намножваючых пакуты люду. Са старасцю звязваецца праклён кансерватызму, упартай прывязанасці да пройгрышнай, нямоднай справы, аднак старасць у апазіцыі да маладосці гэта скарбніца вопыту, жыццёвай праўды, ведаў, якія суправаджаюцца адабрэннем, зычлівасцю да свету, хрысціянскай пагодлівасцю духу. Стары чалавек бывае і падазроным, бо жыве задоўга ды памятае зашмат. Разгарачаны малады чалавек паказваецца радыкалам, які рэагуе на свет адораны, здаецца, выразнымі кантрастамі, межамі паміж любоўю і нянавісцю, чарнатой і беллю, мае за нішто нюансы, плаўныя пераходы, цень замест выразнай рысы, мігатлівасць каштоўнасцей.

Вядомыя ж старцы як вечныя рэвалюцыянеры хоць бы з камедыі Славаміра Мрожка „Танга", прывязаныя да тае аднае, адзінае ідэі фанаты — кажуць, псіхоз ці неўроз знакаміта кансервуюць. Выдатны польскі паэт Збігнеў Герберт пачынаў творчы шлях як усхваляльнік класіцызму, ладу і спакою, супрацьстаяўшы рэвалюцыі, каб на схіле жыцця стаць кансерватыўным радыкалам, з групы тых, што мінулае стараюцца вярнуць са зброяй, паўстанцкім актам. Гэта рэдка сустраканы від гнозісу, маніхейства, які бачыць свет пагружаны ў няшчадным змаганні сіл дабрыні і зла.

Старэчая філасофія асацыюецца яшчэ як тая, што распаўсюджвае апаскі адносна будучыні, змяшчае перасцярогі для нявопытных і маладых, выказвае патрэбу бяспекі. Часта яе кансерватызм схіляе ў прорву быццам бы залатога мінулага, да падзей, якія мінулі і ў якіх няма права на вяртанне. Бачу святых старцаў у цывілізацыі праваслаўя, манахаў, пустэльнікаў, самотнікаў, да якіх паломнічалі тлумы верных па параду, па навуку (як да старца Зосімы з рамана Фёдара Дастаеўскага „Браты Карамазавы").

Тым часам бліжэйшы пагляд на з'яву старасці даводзіць, што праблема спеласці, старасці, прамінання ў гісторыі Еўропы адносна новая. Яшчэ ў сярэднявеччы маладыя хлопцы і дзяўчаты ўводзіліся ў дарослае жыццё, а непаўналетнія юнакі вялі арміі на барацьбу з бязлітасным ворагам, узначальвалі дзяржавы. Высокая смяротнасць у выніку эпідэмій, шматлікіх войнаў даводзіла да таго, што тыя, хто дажываў глыбокай старасці, трактаваліся як незвычайныя, цудоўныя асобы. Сярэднія вякі не ведалі з'явы дзяцінства. Працяглае дзяцінства — твор блізкай нам сучаснасці, калі маладосць пашыраецца на гады адукацыі, на студэнцтва. У багатых грамадствах Захаду развінулася агромная прамысловасць на патрэбы багатых малалетак; узмацніліся з'явы інфантылізацыі паводзін, трывалай няспеласці. Румынскі мысляр Эміль Чоран асцерагаў, што туга па варварстве, дзікасці, маладосці — прыкмета схілу цывілізацыі.

У літаратурным мастацтве свету маладосць асацыюецца з мастацтвам паэзіі — пералічваюцца пры тым Лермантаў, Рэмбо, Багдановіч ці Ясенін, якія, хоць зарана адышлі, усё ж пакінулі важкія творы. Затое спелая проза патрабуе доўгіх гадоў вопыту, роздумаў. Як цудоўны мудрэц бачыцца, напрыклад, Васіль Быкаў.

Знакаміты жывапісец і эсэіст Ежы Навасельскі заўважыў, што ён — творца, які змагаецца з упорным матэрыялам — самотны. Самотны мастак мусіць быць цвёрдым і бязлітасным, бо яму няма адкуль чакаць апірышча. Застаюцца яму толькі старыя аўтары, майстры, класікі, мёртвая літаратура, што перадаецца з пакалення ў пакаленне. І такая вось мараль — малаэтычная.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Адышоў Браніслаў Герэмэк

— Польшча павінна мець як найлепшыя стасункі з Беларуссю, але, на жаль, замінае гэтаму палітычная сітуацыя ў Беларусі, парушэнне правоў чалавека. Мы павінны развіваць цяпер гаспадарчыя, культурныя і навуковыя адносіны ды пачакаць добрай атмасферы для развіцця палітычных стасункаў. Цяперашнія палітычныя стасункі гэта мінімум кантактаў. Польшча з'яўляецца прававой дзяржавай, якая шануе правы чалавека, і патрабуе гэтага ад сваіх суседзяў, — так гаварыў... Ну вось, ці адгадалі вы хто і калі выказаў гэтыя ўсё актуальныя словы? Прафесар Браніслаў Герэмэк у жніўні 2001 г. у размове з Міхасём Андрасюком у эфіры Радыё Рацыя. Словы прафесара ўсё сутыкаюцца з рэальнасцю і польска-беларускімі сувязямі. На жаль, прафесара ўжо няма між намі. Аж хочацца сказаць, што загінуў ён без толку, у дарожнай аварыі.

У сувязі з гэтай трагедыяй, агромнай стратай для польскай і міжнароднай палітычнай эліты, я зноўку пераглянуў ягоныя выказванні, вярнуўся да ягоных думак, якімі дзяліўся ён з іншымі на шматлікіх айчынных і замежных форумах, між іншым на гэтым апошнім — у Еўрапарламенце, і не толькі на гэтых афіцыйных у якасці міністра замежных спраў. Вядома, найбольш цікавілі мяне ягоныя развагі аб Беларусі і польска-беларускіх стасунках. У размове з Міхасём Андрасюком прафесар, выдатны гісторык, гаварыў:

— Гэта балючая справа, што Беларусь страціла шмат часу. Я спаглядаў на Беларусь з надзеяй на пачатку дзевяностых. Але здарылася інакш. І шкада, што так атрымалася. Якраз беларуская меншасць у Польшчы можа шмат зрабіць для Беларусі і Еўропы.

Калі прыгадалася мне гэтае выказванне, прыпомніліся таксама словы Тадэвуша Канвіцкага — легенды польскай літаратуры і фільма, чалавека Вялікага княства Літоўскага, якія прагучалі ў інтэрв'ю для „Нівы":

— У мяне ёсць крыху жалю да беларусаў Польшчы. Даходзіць да мяне водгалас сварак на Беласточчыне. Адначасова мяркую, што замала ўвагі звяртаюць яны на тое, што адбываецца ў самой Беларусі. На маю думку, польскія беларусы павінны адчуваць сваю адказнасць за тое, што там адбываецца, больш клапаціцца і пераймацца іхнім лёсам.

Вернемся, аднак, да разваг, якія пакінуў па сабе Браніслаў Герэмэк. Прывяду тут некалькі з іх, якія, мабыць, будуць актуальныя доўгі час, а некаторыя можа заўжды:

— Рацыя Польшчы павінна быць накіравана на Беларусь, Літву і Украіну. Не толькі па гістарычных прычынах, але таму, што ў гісторыі гэтых народаў іх спалучала ўсё (...). Там, дзе грамадскасць хоча паставіць помнік, павінна мець на гэта права і такія дзеянні маюць служыць паляпшэнню польска-беларускіх стасункаў. Праўда не нараджае канфліктаў, праўда іх вырашае.

— Там [у Кітаі, Бірме, а не ў Беларусі — М. Х.] улады адчуваюць, што могуць утрымацца, прымяняючы сродкі насілля.

— Важна, каб з польскага боку была яснасць прынцыпаў і першым прынцыпам павінна быць адбудаванне месца для Беларусі ў Еўропе.

— Я хацеў бы, каб еўрапейская і польская палітыка мелі такі прынцып, што ёсць месца — свабоднае, адкрытае і чакаючае — для Беларусі ўва ўсіх працэсах еўрапейскай інтэграцыі і толькі ад яе будзе залежаць, калі гэтае месца будзе занятым.

Чытаючы ў апошні час польска-шведскую прапанову ўсходняга партнёрства Еўрасаюза, думаю, што апошняя думка праф. Герэмка павінна стаць яе эпіграфам. Пакуль што тое месца для Беларусі надалей застаецца пустым. Пустое месца засталося таксама пасля Браніслава Герэмка.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Раз на возе, раз пад возам (2)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Самая нізкая рэнтабельнасць малочнай прадукцыі атрымліваецца ў гаспадароў, якія гадуюць толькі па некалькі кароў

(працяг; пачатак у 29 нумары)

Нашы сяляне асаблівую ўвагу адводзяць жывёлагадоўлі, а прыбытак ад продажу малака амаль у кожнай сям'і быў пастаяннай крыніцай сродкаў прызначаных на бягучыя расходы. Здараліся ў мінулым рэдкія выпадкі, калі маладыя энтузіясты разбудоўвалі статкі кароў да дзесятак штук, але найчасцей нашы сяляне гадавалі па 3-5 кароў. Калі ў дзевяностых гадах рэзка панізілася рэнтабельнасць малочнай прадукцыі, многія старэйшыя гаспадары сталі зводзіць і тую гадоўлю да мінімуму, неабходнага для забеспячэння патрэб сваёй сям'і. Аднак з часам кан'юнктура ў прадукцыі малака, так як і ў іншых сектарах сельскай гаспадаркі, паправілася і гэты момант выкарыстала частка малодшых земляробаў. Паявіліся буйныя гаспадаркі размерам у 100-500 гектараў, а ў новазбудаваных аборах, у галоўным за еўрасаюзныя датацыі, нашы земляробы сталі гадаваць па 20-50 кароў, а на Гайнаўшчыне некаторыя фермеры сталі гадаваць нават па больш чым 100 кароў. У такім выпадку пры планаванні сельскагаспадарчай прадукцыі гаспадары не глядзелі ўжо нават на кароткатэрміновую кан'юнктуру, толькі сталі разлічваць на рэнтабельнасць сваёй прадукцыі на працягу прынамсі пяцігодак. Зараз яны не маюць магчымасцей пераключацца з адной прадукцыі на другую, бо ўклалі так многа грошай у будову вялікіх абораў і куплю сельскагаспадарчых машын, што цяжка ім мяняць профіль гаспадарання. Калі, пачынаючы з восені мінулага года, сталі моцна павышацца цэны збожжа, ускладніліся ўмовы вытворчасці малака.

Маларэнтабельнае малако

Разам з павышэннем цэнаў збожжа выраслі таксама цэны камбікармоў. Калі рэзка павысіліся кошты малочнай прадукцыі (асабліва ў выпадку, калі гаспадары купляюць корм), пачынаючы таксама з восені 2007 года ў агульным пастаянна стала падаць закупачная цана малака. Калі ўзяць сярэднія цэны малака ва ўсёй Польшчы, дык яшчэ ў снежні 2007 года за малако плацілі 1,32 зл. (студзень 2008 года — 1,25 зл., люты — 1,21 зл., сакавік — 1,16 зл., красавік — 1,11 зл., май — 1,05 зл.). Аднак нашы гаспадары, якія гадуюць па 3-8 кароў у традыцыйных хлявах і пастаўляюць малако ў вясковыя пункты скупкі, найчасцей не маглі разлічваць нават на вышэйпрыведзеныя цэны, бо малочныя кааператывы больш плацяць буйным пастаўшчыкам.

— Мы, уводзячы некалькі катэгорый закупачных цэн, залежных ад колькасці пастаўленага малака, хочам заахвоціць нашых гаспадароў да яшчэ большай вытворчасці малочнай сыравіны, — патлумачыла старшыня Гайнаўскага малочнага кааператыва Вера Паўлючук. — Аднак не плацім больш за малако, якое бярэм з ахаладжальнікаў ад паасобных гаспадароў, у параўнанні з малаком, якое гаспадары возяць у вясковыя пункты скупкі, калі яно аднолькавай якасці. Затое часта бывае так, што ўласнікі ахаладжальнікаў прадукуюць больш малака, чым іх суседзі і за большую прадукцыю атрымліваюць даплату. За малако, якое захоўваецца ў ахаладжальніках, сяляне таксама атрымаюць лепшую цану, бо яно лепшай якасці, чым у дробных пастаўшчыкоў.

— Тыя, што купляюць многа збожжа на корм для кароў, вельмі адчулі вялікія кошты цяперашняй прадукцыі малака, бо ж з восені мінулага года рэзка падаражэла збожжа. Зараз прабытковасць малочнай прадукцыі невялікая, але, гадуючы кароў, нельга раптоўна пераключыцца на іншую прадукцыю, бо пасля, хацеўшы вярнуцца да вытворчасці малака, трэба вельмі доўга адбудоўваць статак. Каб самому з цяляці выгадаваць карову, трэба ж чакаць два гады. Старшыня Гайнаўскага малочнага кааператыва Вера Паўлючук суцяшае, што цана малака не павінна ўжо падаць, толькі павышацца, — заяўляе солтыс Чыжыкаў Уладзіслаў Нічыпарук, які гадуе 25 кароў. Такой надзеяй жывуць і іншыя вытворцы малака, асабліва тыя, якія ў гадоўлю кароў уклалі вельмі вялікія грошы, разбудоўваючы статак да 100-150 кароў. У гэтым годзе ў Польшчы агульная колькасць выпрадукаванага малака не перавысіла ліміту прадугледжанага для нашай краіны Еўрасаюзам. Таму і гаспадары, якія прадалі больш малака, чым ім было дазволена паводле еўрасаюзных лімітаў, не будуць пакараны, як гэта было ў мінулых гадах. Некаторыя гаспадары атрымаюць нават невялікае павышэнне лімітаў прадукцыі. Павышэння цэн малака чакаюць таксама гаспадары, якія гадуюць па 4-5 кароў і атрымліваюць па 60-65 грошаў за літр, калі яно крыху горшай якасці або ў ім мала бялку.

— За маё малако найбольш плацілі ў снежні мінулага і ў студзені гэтага года. Тады разам з прэміяй атрымаў я па 1,7-1,8 зл. за літр малочнай сыравіны. Пасля цана ў Гайнаўскім малочным кааператыве стала падаць і ў лютым заплацілі мне па 1,4 зл., у сакавіку і красавіку — па 1,2-1,25 зл. Калі ў маі і чэрвені каровы выйшлі на траву, панізілася колькасць бялку ў малацэ, што супала з чарговым паніжэннем цаны і тады атрымаў я па 91-92 грошы за літр малака. Аднак я прадукую ўжо крыху большую колькасць малака, чым гаспадары, што гадуюць па некалькі кароў. Людзі, якія пастаўляюць малако ў пункт скупкі гаварылі, што за сыравіну з параметрамі падобнымі да маіх плацілі толькі па 78 грошаў за літр, — удакладняе Уладзіслаў Нічыпарук. — Найбольш на гандлі малаком зарабляюць пасрэднікі, якія ўстанаўліваюць вялікія нацэнкі і таму малочныя прадукты ў магазінах дарагія.

Пратэст нямецкіх фермераў

Паводле нашых гаспадароў прадукцыя малака застаецца яшчэ рэнтабельнай, хаця ў некаторых выпадках прабытковасць сапраўды мінімальная. Інакш думаюць фермеры з Германіі, якія нядаўна сталі пратэставаць супраць павышэння лімітаў прадукцыі малака ў Еўрасаюзе (у красавіку 2008 года агульная колькасць была павышаная толькі на 2%), што, паводле нямецкіх земляробаў, спрычынілася да паніжэння цэн малочнай сыравіны. Сталі яны масава высылаць сваё млако ва ўпакоўках на адрас Еўрапейскай Камісіі. Чыноўнікі ў Бруселі мусілі напрацавацца ў час сартавання малочных упаковак з Германіі і вымушаны былі яшчэ здаваць іх у сартавальні смецця, бо пасля паштовага транспарту без адпаведнага ахалоджвання малако станавілася непрыдатным для спажывання. Чыноўнікі заклікалі нямецкіх фермераў, каб тыя бясплатна здавалі малако ў прытулкі, але ўсхваляваныя нямецкія земляробы спачатку малаком кармілі жывёлу, а пасля рашыліся ў згаданы спосаб звярнуць увагу брусельскіх чыноўнікаў на нерэнтабельную для іх прадукцыю малака. Аднак даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі ў Польшчы намнога меншыя, чым у Германіі і толькі дзякуючы працавітасці і зацятасці нашых гаспадароў аплачваецца ім прадаваць малако па цэнах, якія выклікаюць незадаволенасць у нямецкіх фермераў.

Нашы гаспадары цяжка працуюць

Каб прадукцыя малака была большай, а сыравіна больш якаснай, трэба адпаведна карміць кароў і пастаянна даглядаць іх.

— Я кармлю кароў сіласам (з кукурузы, сена) і збожжавымі мешанкамі, дабаўляючы яшчэ невялікую колькасць канцэнтратаў. Каб не заквасіць кароў, неабходна даваць ім зімой таксама і сена, — тлумачыць Уладзіслаў Нічыпарук.

Каб малако вытрымала клас экстра, трэба каб у ім было вельмі мала бактэрый, чаго можна дабіцца трымаючы вялікую чысціню і захоўваючы малако ў ахаладжальніках. На цану малака вялікае ўздзеянне мае колькасць бялку, якая зімой у гаспадарцы спадара Нічыпарука даходзіць нават да паказчыка 3,4. Затое за тлушч зараз даплачваюць вельмі мала. У 2003 годзе спадар Нічыпарук збудаваў абору, але не змог пакарыстацца падтрымкай еўрасаюзнага бюджэту, як гэта зрабілі многія нашы земляробы.

— Калі я выступаў за дафінансаванне маёй інвестыцыі, патлумачылі, што я надта коратка гаспадару і прыйшлося будаваць абору за свае грошы, — кажа Уладзіслаў Нічыпарук, які павялічвае статак кароў і ў галоўным вялікую ўвагу адводзіць якасці малака.

— Нашы земляробы, незадаволеныя нізкай цаной малака, могуць падумаць пра гадоўлю мясных кароў і бычкоў. Гэтую пароду можна атрымаць з парод кароў, якія зараз гадуюцца на Гайнаўшчыне шляхам крыжавання, — прапануе Геранім Панятоўскі, кіраўнік Павятовага сельскагаспадарчага дарадчага калектыву з Гайнаўкі. Застаецца толькі паставіць пытанне пра рэнтабельнасць вытворчасці ялавічыны і мяса ўвогуле. Але аб гэтым у чарговым артыкуле.

(заканчэнне будзе)

Прачытай, зачым падпішаш...

У 26 нумары „Нівы" ад 29.06.2008 г. друкаваўся тэкст Мікалая Варанецкага „Як у банку", у якім аўтар скардзіўся, што кааператыўны банк у Браньску абдурвае сваіх кліентаў. Абяцаў ім дапісваць да ашчадных укладанняў 8-працэнтныя адсоткі, а ў канчатковым выніку прыпісвае 4 працэнты. Падобная справа, толькі што з банкам ПКО ў Чаромсе, і ў мяне атрымалася. Заключыў я дамову ў ліпені мінулага года на „lokatę inwestycyjną strategicznej alokacji", дзе ў пункце 2 запісана: „Lokata oferowana jest na okres 12 miesięcy i oprocentowana jest wg stałej stopy procentowej w stosunku rocznym. Wysokość stopy procentowej określona dla poszczególnych okresów kwartalnych wynosi: 1,00% p.a. za I okres (і адпаведна)— 2,00% za II okres — 5,00% za III okres i 8,00% za IV okres. Oprocentowanie wypłacane klientowi na koniec okresu umownego wyliczane jest na podst. ww. stopy procentowej i wynosi 4,00% w skali roku". Паводле банкавай арыфметыкі (маёй таксама) атрымліваецца: 1 + 2 + 5 + 8 = 16 : 4 (кварталы) = 4%. Банк, значыцца, не абдурыў кліентаў. Магчыма, працаўнікі банка неадпаведна патлумачылі людзям як будуць дапісаны адсоткі. Але ў дамове ўсё запісана. У такіх выпадках, калі вынікаюць сумненні, найлепш прачытаць тэкст дамовы, пакуль яе падпішацца.

Уладзімір СІДАРУК

З гісторыі раз'язнога гандлю

Ужо, відаць, назаўсёды ў краявід падляшскіх вёсак упісаліся аўталаўкі з прадуктовымі таварамі. Крамы на калёсах з'явіліся некалькі гадоў таму і аказаліся вельмі трапнай ініцыятывай: задаволеныя імі старыя і нямоглыя людзі, якім да стацыянарнай крамы з кожным годам становіцца штораз далей, задаволеныя заробкам таксама гандляры, калі не кідаюць ездзіць.

Гэтая новая на нашым грунце форма гандлю на самай справе не з'яўляецца навінкай. У мае рукі папала фатаграфія раз'язной коннай крамы, якая ў дваццатых гадах XX стагоддзя дзейнічала ў Маскве. З надпісаў на лаўцы-фургоне можна даведацца, што ўласнікам гэтай крамы было Спажывецкае таварыства рабочых „Чырвоная Прэсня" (Прэсня — квартал Масквы). Купіць у гэтай краме можна было, прынамсі тэарэтычна, гарбату, цукар, каву, крупы, хлеб, звычайныя і здобныя булкі, кансервы, мыла, соль і, відаць, іншыя гэтага тыпу тавары. Пэўна арганізацыю такога роду продажу назвалі тады „смелым эксперыментам", але паколькі эксперымент удаўся, тады праз нейкі час яго закінулі. Як гэта ў сацыялізме...

М. Ц.

ХОЧУЦЬ ПЕРАЙСЦІ ў Арлянскую гміну

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

За час свайго існавання Арлянская гміна шматразова мяняла свае межы і адміністрацыйнае падпарадкаванне; у 1921 годзе апынулася яна ў межах Бельскага павета. Паводле перапісу ад 5 студзеня 1945 года пражывала ў ёй 10 064 душ, у тым ліку 9 832 беларусаў. У канцы 2007 года на тэрыторыі Арлянскай гміны пражывала 3 395 асоб, а дзесяць гадоў раней гэты лік быў большы за чатыры тысячы. Зараз у складзе гміны 22 салэцтвы (26 мясцовасцей). Да восені 1995 года да Арлянскай гміны належала вёска Крывая, якая тады — у выніку вясковага рэферэндуму і рашэння Ваяводскага сейміка — адышла да Бельскай гміны; прычынай адыходу было незадавальненне дзеяннямі тадышніх арлянскіх гмінных улад... Зараз з'явілася нагода павелічэння Арлянскай гміны на дзве іншыя вёскі.

25 чэрвеня г.г. арлянскі войт Пётр Сэльвесюк паведаміў удзельнікам пасяджэння Самаўрадавай камісіі:

— У нашу Гмінную ўправу паступіла заяўка з Дубяжынскага салэцтва (а гэта дзве вёскі — Дубяжын і Падбелле) пра адлучэнне гэтых вёсак ад Бельскай гміны і далучэнне да Арлянскай. Заяўку падрыхтаваў пратэстацыйны камітэт, які мы запрасілі на пасяджэнне...

Патрэбныя пастановы абедзвюх рад, кансультацыі ў абедзвюх гмінах — гэта складаная справа і працяглая... Такая самая заяўка ў той самы дзень паўгадзіны раней была пададзена ва ўправу Бельскай гміны. Я ў Дубяжыне з часу выбару мяне на пасаду войта Арлянскай гміны яшчэ не быў. І не я быў ініцыятарам гэтага пераходу, але будзе прыемна, калі наша гміна ўзбуйнее, — сцвердзіў войт.

Дэлегаты ад Дубяжына на сесіі Гміннай рады ў Орлі

Наступнага дня, 26 чэрвеня, на пасяджэнне Гміннай рады прыбыло чатырох дэлегатаў ад Дубяжына. Старшыня Рады папрасіў іх узяць голас. Яны зачыталі заяўку, у якой м.інш. гаварылася: „Салэцкая рада ад імя жыхароў вёсак Дубяжын і Падбелле падае заяўку ў арлянскую Гмінную раду дзеля далучэння згаданых мясцовасцей — разам з грунтамі паводле стану на дзень 3 чэрвеня 2008 года — да Арлянскай гміны. Абгрунтаванне: Гэтае рашэнне Салэцкая рада прыняла беручы пад увагу пагрозу жыццю і здароўю жыхароў ад планаванай на грунтах вёскі Дубяжын пабудовы Прадпрыемства добраўпарадкавання адкідаў (Zakład Zagospodarowania Odpadów — ZZO). Сузіраючы мінулае, відаць, што мэтанакіравана засакрэчваліся перад жыхарамі пагрозы, якія стварае дзейнасць ZZO, у выніку гэтага вяскоўцы прымалі няправільныя вырашэнні. Жыхары адчуваюць, што іх абманулі і далей абманваюць. Супрацоўніцтва з Управай гміны ў Бельску-Падляшскім стала немагчымым. У выніку Салэцкая рада мяркуе, што лепшым рашэннем будзе змена гмінных граніц і далучэнне жыхароў Дубяжына і Падбелля да Арлянскай гміны. Просім Гмінную раду ў Орлі пачаць адміністрацыйны працэс змены гмінных граніц і станоўчы разгляд нашай просьбы. Спадзяемся ўзорнага супрацоўніцтва Гміннай управы ў Орлі з нашымі жыхарамі". Пад заяўкай Салэцкай рады падпісалася пяць чалавек.

Далей голас узяў войт Пётр Сэльвесюк:

— Шаноўнае спадарства! Вялікае дзякуй жыхарам Салэцтва Дубяжын за прыбыццё на наша пасяджэнне і за падачу гэтай заяўкі. Рашэнне пра далучэнне ці яго адмову прыме Гмінная рада, кампетэнтная ў гэтай справе. Я, як войт, за тое, каб гэтыя дзве вёскі далучыць да нашай гміны. Са свайго боку абяцаю добрае супрацоўніцтва і, галоўным чынам, рэалізацыю інвестыцый. Бачым, што Арлянская гміна развіваецца найхутчэй у Бельскім павеце. У сувязі з гэтым спадзяюся, што гэты працэс удасца завяршыць станоўча так для нас, як і для жыхароў Салэцтва Дубяжын. Чарговым крокам будзе прыняцце рашэння Гміннай радай у Орлі і тады пачнём адміністрацыйны працэс. Будуць патрэбны пастановы дзвюх гмінных рад — арлянскай і бельскай — а пасля рашэнне міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі. Можна, такім чынам, лічыць, што адміністрацыйны працэс запушчаны.

Войт звярнуўся да радных за сумненнямі і запытаннямі Я спытаў, што будзе, калі арлянская Гмінная рада дасць згоду, а бельская — не. Войт адказаў, што рашэнне бельскай рады не з'яўляецца вырашальным для Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. Гэты дакумент толькі вызначае далейшы ход працэсу і не з'яўляецца падставай ні для адмоўнага, ні для станоўчага рашэння.

Радны Марцін Кубай з Міклашоў спытаў гасцей, чаго яны спадзяюцца ад Арлянскай гміны.

— На сённяшні дзень разыходзіцца нам пра прыблакіраванне пабудовы гэтай звалкі, а больш ніякіх патрабаванняў не маем.

Я спытаў пра лік жыхароў у салэцтве.

— Двухсот. Супраць пабудовы выказаліся 152 асобы, але на бюлетэні было запісана нас 250 чалавек, якіх лік пасля паменшаў.

Больш запытанняў не было і старшыня Рады Аляксандр Клін падзякаваў дэлегатам за прыбыццё і яны ўжо сталі падымацца з крэслаў. Але зноў узяў голас войт:

— Я маю яшчэ адно запытанне, у прынцыпе да радных. Мы на сённяшняе пасяджэнне не прыгатавалі рашэння Гміннай рады, але я спытаю і папрашу прагаласаваць ці можам пачынаць той працэс, ці радныя не супраць гэтай ініцыятывы?

Радныя аднадушна выказаліся за далучэнне. Я яшчэ спытаў як далёка зайшлі справы з пабудовай звалкі.

Госці адказалі, што дакладна не ведаюць, але грунты яшчэ не пераквалікаваны ў будаўнічы ўчастак. Справа ў тым каб прыблакіраваць, каб не марнаваць грошай на даследаванне. А гэта 80 гектараў зямлі IVa і IVb класаў — вось такая буйная мае там быць будоўля. І шкада такой зямлі, якая ў паўтара кіламетра ад вёскі. І гэта грунты пасляпэгеэраўскага агенцтва, і лёгка іх здабыць, і падыходзяць яны пад пабудову, — сцвярджалі ў завяршэнне занепакоеныя дэлегаты ад Дубяжына.

* * *

Ініцыятарам пабудовы ZZO ў Бельскім павеце выступіла ў чэрвені 2003 года Бельскае староства. Тады бельскі староста інфармаваў войтаў і бурмістраў, што лакалізацыя звалкі недалёка Дубяжына найбольш аптымальная беручы пад увагу велічыню, акружэнне, планістычныя дзеянні і ўласніцкую структуру. Гэта грунты казны, падпарадкаваныя Агенцтву сельскагаспадарчых нерухомасцей у Сувалках і ёсць магчымасць 85-працэнтнага дафінансавання праекта з боку Еўрапейскай камісіі.

Але чарговая сустрэча, 7 лістапада 2003 года, не прынесла спадзяванага старостам адабрэння, бо паявіліся сумненні, асабліва з боку Арлянскай гміны, бо планаваная звалка была б у адлегласці 1 650 метраў ад крыніцы вады для Арлянскай гміны, што ў Алекшах. Таксама войт Браньскай гміны адмовіўся далучыцца да мерапрыемства. Ужо 26 лістапада 2003 года староства абнародавала гідрагеалагічны аналіз планаванай каля Дубяжына інвестыцыі адносна крыніцы ў Алекшах, які пацвярджаў правільнасць павятовай задумы.

Паводле інфармацыі з чэрвеня мінулага года, рэалізацыя інвестыцыі адтэрміноўваецца з прычыны працяглаcці адміністрацыйных працэдур рэгістрацыі камунальнага згуртавання гмін ад Бельскага, Гайнаўскага і Сямятыцкага паветаў. Каарданацыйная роля Бельскага староства закончылася з занясеннем інвестыцыі ў спісак прыярытэтаў Ваяводскага фонду аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі ў Беластоку і пераняццем тою ўстановай вядзення ўсіх звязаных з гэтым спраў.

Аднак мерапрыемства рэалізуецца ў незадавальняючых тэмпах, большасці задач не зрэалізавана. У лік поспехаў можна запісаць выхадайнічанне горадам Бельск-Падляшскі дафінансавання пабудовы сучаснай звалкі на грунтах вёскі Ягуштова вартасцю ў амаль 3 250 тысяч злотаў і дзеянні староства ў напрамку заснавання супольнага для трох паветаў ZZO.

* * *

Свет рухаецца наперад і мяняецца. Часта тое, чаго сёння баімся і не хочам, становіцца з ходам часу неабходным. Аднак за чалавечае дабро трэба заўсёды змагацца. А свет і так ніколі не быў усім справядлівым...

Узаемнае зацікаўленне

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

І не было пералому, хоць фактам з'яўляеца тое, што дайшло да гэтай сустрэчы, і гэта ўжо падзея. Пасля пяці гадоў перапынку ў Брэсце адбылося VII пасяджэнне Польска-беларускай міжурадавай каардынацыйнай камісіі па справах трансгранічнага супрацоўніцтва.

Камісія дзейнічае на падставе паразумення паміж урадамі Польшчы і Беларусі ад красавіка 1992 г. Апошняе такое спатканне адбылося ў Беластоку ў маі 2003 г. Амаль на пачатку пратакола з брэсцкага, двухдзённага пасяджэння, старшынюючы яму Пётр Стаханьчык, віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі (шэфстваваў польскаму боку) і віцэ-міністр замежных спраў Беларусі Андрэй Еўдачэнка (шэф ад беларускага боку) заявілі досыць дыпламатычна: „Бакі пацвердзілі зацікаўленасць садзейнічаннем і наладжваннем кантактаў паміж Польшчай і Беларуссю ў галіне трансгранічнага супрацоўніцтва і з задавальненнем прынялі аднаўленне прац камісіі". І далей: „Бакі выказаліся за актывізацыю міжрэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва і за пашырэнне кантактаў паміж Польшчай і Беларуссю, асабліва паміж Люблінскім і Падляшскім ваяводствамі ды Брэсцкай і Гродзенскай абласцямі (гмінамі, паветамі, гарадамі і раёнамі) абедзвюх дзяржаў".

Удзельнікі сустрэчы працавалі ў пяці падкамісіях па справах: прасторавага планавання, прыгранічнага супрацоўніцтва, пагранпераходаў і інфраструктуры, міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, еўрасаюзных праграм па трансгранічным супрацоўніцтве, Аўгустоўскага канала, Белавежскай пушчы, юрыдычна-трактатнай базы. З вызначэнняў вынікае, што прадугледжваюцца працы над новым планіровачным дакументам для прыгранічных рэгіёнаў абедзвюх краін. У рамках падкамісіі па справах трансгранічнага супрацоўніцтва было вызначана, што неабходным з'яўляецца працяг супрацоўніцтва ў галіне аховы асяроддзя „прынамсі на ўзроўні існуючым да гэтай пары", а прадстаўнікі Беларусі маюць быць запрошаны ў Польшчу на Міжнародны семінар выратавальных службаў, Чэмпіянат пажарнікаў і вадалазаў ды Міжнародны лагер пажарных атрадаў. Мела б узнікнуць спецыяльная рабочая група ў гэтай падкамісіі, якая каардынавала б дзеянні па прадухіленні забруджвання памежных вод, прадугледжваюцца дзеянні дзеля хутчэйшага падпісання паразумення паміж РП і РБ аб супрацоўніцтве ў галіне прадухільвання катастроф, стыхійных няшчасцяў і іншых надзвычайных сітуацый ды ліквідацыі іх вынікаў.

Калі гаворка аб пагранпераходах і інфраструктуры, то было заяўлена, што ў кастрычніку будуць дэталёва абмеркаваны пытанні стварэння дарожных пагранпераходаў Ліпшчаны — Сафіева і Владава — Тамашоўка. „Адначасова падкамісія прапануе ўзяць пад развагу адпаведнымі органамі абодвух бакоў магчымасці пашырэння ўезду з Польшчы ў Беларусь на дарожным пагранпераходзе Кузніца-Беластоцкая — Брузгі, а таксама пабудову другога моста на дарожным пагранпераходзе Баброўнікі — Бераставіца". Беларускі бок паінфармаваў таксама Камісію аб планах мадэрнізацыі дарожнага перахода Полаўцы — Пяшчатка з наступнага года. Справа ў пашырэнні руху на гэтым пагранпераходзе. Падобная мэта ў мадэрнізацыі на беларускім баку пагранперахода Славатычы — Дамачова, якая мае быць завершана ў 2009 г.

Здаецца, найбольш агульныя заявы прагучалі пасля пасяджэння падкамісіі па справах міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Паказаны былі тут толькі „прыярытэтныя напрамкі дзеянняў" датычныя эканамічнага супрацоўніцтва, кантактаў у галіне спорту і турызму, культурнага, навуковага, асветнага супрацоўніцтва, аховы здароўя, маладзёжнага абмену, супрацоўніцтва вышэйшых навучальных устаноў. „Бакі ўзгоднілі мэтазгоднасць арганізацыі ў 2008-2009 гадах супольных мерапрыемстваў, прысвечаных шасцісотгадоваму юбілею аховы Белавежскай пушчы (навуковая канферэнцыя, сімпозіум, супольнае ўрачыстае пасяджэнне і да г.п.").

У справе Аўгустоўскага канала, які мае быць занесены ў Спісак сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, Камісія ўказала на паскарэнне заключэння паразумення паміж РП і РБ у сферы ўтрымання і суднаходства на гранічным адрэзку Канала. Камісія бачыць таксама патрэбу заключэння яшчэ сёлета адпаведнага паразумення паміж міністрамі Польшчы і Беларусі аб супрацоўніцтве ў галіне выкарыстання, аховы і ўраўнаважанага развіцця трансгранічных тэрыторый датычных Белавежскай пушчы. Дарэчы, справа паскарэння іншых паразуменняў і дамоваў таксама абмяркоўвалася ў Брэсце, м.інш. дамоў аб захоўванні і выкарыстанні трансгранічных вод, аб стварэнні трансгранічнага біясфернага запаведніка „Заходняе Палессе" (Польшча, Беларусь, Украіна), аб утрыманні гранічных мастоў. Падпісаны маюць быць таксама польска-беларуска-літоўскія і польска-беларуска-ўкраінскія пагадненні аб стыку дзяржаўных межаў. „Камісія прыняла да ведама просьбу беларускага боку ў пытанні абмеркавання змякчэння працэдуры выдачы польскімі консульскімі ўстановамі ў РБ шэнгенскіх віз для беларускіх перавозчыкаў, а таксама заяву польскага боку аб увядзенні змякчэнняў у працэдуру выдачы перавозчыкам беларускіх віз консульскімі ўстановамі РБ на тэрыторыі РП".

Урэшце была пастаўлена справа, якая вельмі цікавіць жыхароў памежных тэрыторый. Вось „Камісія адзначыла неабходнасць інтэнсіфікаваць працы па падрыхтоўцы праекта Паразумення паміж Урадам РП і Урадам РБ аб прынцыпах малога памежнага руху". Гэтая справа знаходзіцца ў распараджэнні міністэрстваў замежных спраў. Чарговы раунд перагавораў на гэтую тэму мае адбыцца 23-24 ліпеня ў Мінску. Беларусы прадставілі ўжо палякам карту абшараў, якія маюць быць ахоплены дамовай з беларускага боку. Пакуль яна сакрэтная. З нашых неафіцыйных інфармацый вынікае, што наколькі дамова ахопіць Брэст, то невядома ці Гродна апынецца ў абшары малога памежнага руху. Калі будзе прынята гэтая дамова таксама невядома. Еўрапейская камісія апратэставала падобную дамову Польшчы з Украінай, а — як кажа прэс-сакратар МЗС у Варшаве Пётр Пашкоўскі — мела яна быць узорам для падпісання такой самай з Беларуссю (ахопліваць мела яна зону 30 км).

Аўгустоўскі канал спалучае

Вяртаючыся да пасяджэння Міжурадавай камісіі ў Брэсце, прымалі ў ёй удзел таксама падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі і ваявода Мацей Жыўна.

— Напэўна наступіла пацяпленне. Перш за ўсё варта размаўляць. Не такіх вынікаў, аднак, мы спадзяваліся. Беларусы былі вельмі гасцінными, але не пайшлі, аднак, на адкрытасць, — сказаў „Ніве" пасля візіту маршалка ў Брэст яго прэс-сакратар Ян Квасоўскі.

Тым часам ваявода (быў старшынёй падкамісіі па справах трансгранічнага супрацоўніцтва) пры нагодзе візіту ў Беларусь наведаў таксама Гродна. Сустрэўся ён там са старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам Саўчанкам. Прагучалі дэкларацыі, якія датычылі вызначэнняў Каардынацыйнай камісіі ды гаспадарчага супрацоўніцтва абодвух рэгіёнаў.

Чарговае пасяджэнне Міжурадавай каардынацыйнай камісіі па справах трансгранічнага супрацоўніцтва мае адбыцца ў першым паўгоддзі наступнага года. Тым не менш за той час маюць працаваць адпаведныя рабочыя групы.

За колькі?

Наведваюць мяне шматлікія госці і ўсім ім я вельмі рады. Кожнаму стараюся паказаць на Падляшшы як найбольш цікавых мясцін, усім расхвальваю чароўнасць гэтай зямлі, прыгажосць краявіду і зычлівасць мясцовага насельніцтва. Але тое, што здарылася майму госцю 25 чэрвеня ў Мядзвежыках (між Мілейчычамі і Чаромхай), лічу выпадкам адасобленым, хаця аказаўся ён для нас вельмі прыкрым і неспадзяваным.

Мая дваюрадная сястра Альжбета Літвіновіч — мастачка з немалымі мастацкімі дасягненнямі — вядомая не толькі ў Лодзі, дзе жыве, але і ў краіне і замежжы, дзякуючы шматлікім выстаўкам. Найчасцей малюе яна вясковыя ландшафты і ўжо некалькі гадоў прыязджае да мяне ў пошуках тэмаў. Тады аб'язджаем мы вёскі і лясы Беласточчыны, а яна фатаграфуе цікавыя краявіды і аб'екты, каб потым у сваёй майстэрні намаляваць тое, што пабачыла. Яе карціны ў аматараў жывапісу карыстаюцца папулярнасцю.

У згаданы дзень выехалі мы рана, а наш доўгі маршрут пралягаў праз Мілейчычы, Чаромху, Орлю, Чыжы ў Нарву і далей у „Нарваўскую краіну адкрытых аканіц". Па дарозе, у Мядзвежыках, сястры спадабаліся драўляныя халодныя будынкі на перадапошняй, хіба, сядзібе па левым баку. Спынілі мы машыну, сястра дастала фотаапарат і падышла да панадворка ды папрасіла ў гуляючых там людзей дазволу зрабіць некалькі здымкаў. У адказ адна з прысутных там жанчын запытала: „А за колькі?" Такое стаўленне ашарашыла сястру, але праз хвілінку яна запытала: „А колькі жадаеце?". „Не ведаю", — адказала жанчына. „Дзесяць злотых хопіць?" — запытала сястра. „Можа быць", — сказала гаспадыня панадворка. Усхваляваная сястра вярнулася да машыны, узяла грошы, занесла іх кампаніі на панадворку і, страціўшы ахвоту фатаграфаваць, вырашыла ехаць далей. Нас абаіх гэтая сітуацыя знервавала. Канешне, справа не ў грошах, толькі ў хамскім хітрунстве, з якім прыйшлося нам мець дачыненне. Мне было страшэнна сорамна за гэтых людзей, бо раней я салаўём разліваўся, расхвальваючы зычлівасць і гасціннасць жыхароў нашых вёсак. А тут на табе: за дурныя дзесяць злотых папсавалі нам усю гэтую карціну.

Думаецца мне, што гэтыя людзі не з'яўляюцца пастаяннымі жыхарамі Мядзвежык. Сведчылі аб гэтым машына на беластоцкіх нумарах і гарадскі выгляд кампаніі. Карэнныя жыхары вёскі такімі паводзінамі не абняславіліся б. Іншая справа іх дзеці або ўнукі — гарадскія хітруны.

Ну і атрымалася так, як у песеньцы Кубы Сянкевіча: „Jestem z miasta: to widać, słychać i czuć!"

М. Ц.

Сяброўская бяседа

Войт Гарадоцкай гміны і Гмінны цэнтр культуры ў Гарадку сардэчна запрашаюць на мерапрыемства „Сяброўская бяседа — інтэграцыя нацыянальных меншасцей — культурныя сустрэчы". Мерапрыемства адбудзецца 26 ліпеня 2008 года. Месца сустрэч — урочышча Борык у Гарадку, пачатак — у 17^{00}. У праграме „Сяброўскай бяседы" — канцэрты польскіх, беларускіх і ўкраінскіх калектываў, конкурсы, латкі з рэгіянальнымі вырабамі, паказ феерверкаў, народнае гулянне і шмат іншых атракцыёнаў.

Мерапрыемства ладзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Вершы Віктара Шведа

Настаўніца белмовы

Настаўніца дамоў
З вітаннем дарагім
З радзільні звоніць зноў,
Што ўрэшце ўжо па ўсім.

Муж чуе ў трубцы зброд,
Страшэнны нейкі крык.
— Гэта мужчынскі род
Шуміць і множны лік.

Адам і Ева

Настаўнік Божага закона
Запытаў на ўроку Лявона:
— Хто спакусіў у раю Адама
Каб забаронены яблык згамаў?

— З забароненага дрэва
Яблык падала Адаму Ева.
— І што мусіла далей збыцца?
— Мусіў з Евай ажаніцца.

Раўнапраўе

— Хто цяпер, з тых брахуноў,
Навучыў так брыдкіх слоў?
Як вулічны найгоршы зброд
Мог апаганіць табе рот?

— Матуля, думаю наўрад
Знаеш ты сённяшніх дзяўчат.
Ведай, час даў нам рэальнае
З мужчынамі раўнапраўе.

Лірычны сынок

— Жадаю таце шмат
банкнотаў,
Быццам на яблыні лістоты.
І залатых манетаў маме
Жадаю процьму я таксама.

Смяюцца шчасцем бацькоў
вочы,
— Будзе паэтам наш сыночак!
— Багатымі вы быць павінны,
Я ў вас наследнікам адзіным.

Скарга

— Доктар дарагая,
Што гэта такое,
Заўжды клопат маю
Са сваёй хадою.

Вучыўся я ў школе
Гадкоў надта многа,
Не дайшоў ніколі
У жыцці да нічога.

Расцем з кніжкай ☞

Вавёркі не цярпяць сваіх сяброўак!

Калі чытаеш моладзевую кніжку „Звяры. Сустрэчы з прыродай”*, адначасова думаеш пра свае сустрэчы з дзікімі звярамі. Сапраўды, рэдка з'яўляюцца такія кніжкі, якія абуджаюць пражытыя намі прыгоды. Мы бачым статна-масцітых зуброў у нашай пушчы, працавітых баброў дзесьці за сваёй вёскай або ласак на вясковым гарышчы ў бабулі...

Аўтар, Алесь Наварыч, прапануе нам 17 эцюд-аповедаў пра сысуноў, якія апынуліся пад пагрозай знішчэння. Сярод іх мы сустрэнем зубра, мядзведзя, барсука, хахулю, крата, казулю, бабра, лася, землярыйку, кажана, гарнастая, ласку, вавёрку, вожыка, рысь, лісу, зайца. Найчасцей сустракаем іх сярод дзікай палескай прыроды, у панурых альховых лясах, дзесьці ля непраходных чаратоў з хмарамі камароў і дзікага птаства, ля меліярацыйных канаваў з белымі гарлачыкамі і меч-травой. Чытаем і амаль фізічна адчуваем жывапісную прыгажосць даліны Прыпяці. Ведаем! Вы скажаце, што ўсю інфармацыю пра прыроду мы можам знайсці па інтэрнэце. Сапраўды, аднак гэтая прапанова для лянівых, бо, трымаючы ў руках кнігу Алеся Наварыча, мы можам вандраваць разам з аўтарам па дзікіх кутках яго малой айчыны, назіраць нашых герояў у іх натуральным свеце. Разам з тым мы будзем здзіўляцца іх мудрасцю і вынаходлівасцю, каб у канцы дайсці да высновы, што чалавек многаму навучыўся ад сваіх братоў-сысуноў. Ды якія трапныя псіхалагічныя партрэты прапануе нам Алесь Наварыч. Першая справа — у сваім свеце звер не баіцца чалавека. Мы часта паўтараем, што лось гэта такая дзікая істота. Паслухайце тады:

Мы грэблі на балоце сена. Мы — гэта я, мой брат і бацька. Балота знаходзіцца недалёка ад ракі Прыпяць, вакол не было ні вёсак, ні хутароў. Мы і начавалі на тым балоце, закапаўшыся ў сена, але злыя камары не давалі спакою. Даводзілася ноччу ўставаць і раскладаць дымны касцёр, каб хоць крыху адагнаць машкарэчу. Золкай раніцай мы снедалі. (...) Як мы не заўважылі, што проста да нашага вогнішча падышла ласіха, не магу даўмецца. Не пачулі яе хады. Але яна не ішла ціха. Адкуль яна з'явілася? Ці хавалася за купамі лазы, ці выйшла з-за недалёкага чыгуначнага насыпу? Мы, хто ляжаў перад нашым раскладзеным на старых газетах няхітрым сняданкам, елі, пілі, а як убачылі перад сабой беланогую велічную ласіху, так і знямелі! І жаваць перасталі, застылі з поўнымі ратамі. (...) Ласіха была блізка: у дваццаці-трыццаці кроках. І з такой цікавасцю і здзіўленнем яна глядзела на нас, быццам хацела спытацца: а чаго вы, людзі, тут, пасярод забалочанага лесу, апынуліся? У вачах так і адчувалася пытанне: хто вы?

Часам паводзіны звяроў нагадваюць гульні дзяцей. Аўтар апісвае як выглядаюць вавёрчыныя шлюбныя карагоды: *Звяркі збіраюцца разам у вясёлы гурток і пачынаюць гарэзіць у вершалінах дрэў. А яны скачуць, куляюцца, ганяюцца адна за адной, гэта прыйшоў для вавёрак час кахання... Увогуле, вавёркі вялікія эгаісткі. Яны не цярпяць шумных кампаній. Яны нават не цярпяць сваіх сяброўак.*

Кожны эцюд ілюстраваны рэальным партрэтам звяра (мастак К. С. Ракіцкі). Прапанаваная кніжка можа выдатна ўзбагаціць вашы веды па прыродзе. Але найперш яна будзе натхняць на самастойныя вандроўкі па лясных і балацістых сцежках нашай малой айчыны. І на роздумы пра неабходнасць аховы прыроды.

Кніжку „Звяры” можна набыць у Мінску або пазычыць у бібліятэцы „Зоркі”.

ЗОРКА

* **Алесь Наварыч, *Звяры. Сустрэчы з прыродай*, „Мастацкая літаратура”, Мінск 2004.**

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЯК ПРАВІЛЬНА ТРЭБА АДЗНАЧАЦЬ ГАДАВІНУ ЗНАЁМСТВА

Толькі дзень заставаўся да гадавіны знаёмства Паўліка і Наталкі. Толькі дзень...

А да гэтага быў цэлы год. Год нескончальнага смеху і кропляў раптоўнай самоты. Смаку на вуснах апякаючых пацалункаў і сакавітых вішняў. Асцярожных дотыкаў рук і пяшчотнага лістаўвею.

Усё, да апошняй кропелькі, помніў Паўлік. І хацеў падарыць Наталцы нешта такое, каб помніла аб усім таксама.

Ды толькі нічога пакуль не прыходзіла ў голаў!..

А між тым, дзень паступова ператварыўся ў гарачы вечаровы каменьчык, і аксамітная цёплая ноч апусцілася на зямлю. І стаяў сярод гэтай зямлі Павел, і неадрыўна глядзеў у зорнае неба...

Было яшчэ вельмі рана, калі ён прыйшоў да Наталкі.

— Добрай раніцы, сонейка! — павітаўся міла, прыціскаючы да грудзей невялічкі пакунак. — Ты ведаеш які сёння дзень?

— Так, ведаю, — усміхнулася насустрач дзяўчына. І хацела спытаць, што ж такога незвычайнага ў тым пакунку, як раптам Паўлічак рашуча ўскінуў яго ды страсянуў. І... Увесь пакой, уся падлога засыпаліся, ператварыліся ў рамонкавы цуд, пялёсткавае стракаценне, залаціста-белую незвычайнасць.

— Ступай па іх асцярожна і дачакайся...

— Чаго? — не магла адарваць вачэй ад гэткага хараства дзяўчынка.

— Вечара. Таму што гэта яшчэ не ўсё... — і, моцна прыціснуўшы Наталачку да сябе, юнак раптам выйшаў.

А вечарам... Цёплым, пахнуткім вечарам — кожны рамонак, кожная асобная кветачка — ператварыліся... у залацістыя, яркія, сапраўдныя зоркі! І зіхацеў, пераліваўся, зачароўваў, перапаўняў магічным зорным святлом незвычайны пакой. Не толькі вачэй — усёй сваёй мілай сутнасці не магла адарваць ад тых зорак Наталка.

Кожная была непадробным хараством, і кожную хацелася цалаваць, браць у рукі, глядзець і ўсміхацца.

Толькі была сярод іх — асаблівая, самая яркая і прыгожая.

„Гэта ты, дзяўчынка мая. Як я рады, што знайшоў цябе, маю самую яркую і прыгожую зорачку", — раптам вывеў праменьчык ад месяца на падлозе акуратныя словы, якія адразу засыпаў зорным пылком лёгкі скразняк ад фіранкі.

Але Наталка, вядома, прачытаць тыя словы паспела.

Ваш Дзядзечка Сід

12 ліпеня 2008 г., Кобрын

Міра ЛУКША

Козлік з Козлікаў

Козлік з Козлікаў рашыў:
Што было б, калі б я быў
Вялікім панам Казлюком,
Не ў аборы, меў свой дом,
Дом у Козліках — палац,
А пад ім — абшырны пляц,
З агароднінай гарод,
Вакол саду — такі плот,
Каб ніхто і не ўгадаў,
Хто такі багаты стаў,
Што жыве як які пан
Па-над рогі, па-над стан!
Мо які артыст-мастак,
Што ў „Ла Скале" ён спявак,
Бо як арыю завядзе,
То не чуў ніхто й нідзе,
Каб пяяў прыгожа так
Нетутэйшы ж той спявак?!

А ён лебяду жуе
І ў аборы ўсё жыве.
Мара сваім шляхам ідзе.
Козлік нудзіцца ў бядзе.

Кінь жаваць ты лебяду,
Наракаць усё на бяду!
Нашу „Рэчаньку" знайдзі,
З намі паспяваць прыйдзі!
Будзе разам усім жвавей,
І ярчэй, і весялей,
І гучней, і мацней, —
Усім Козлікам файней!

Музыка з кайфам

„5сот5" мараў пра будучыню

Першы пасляфестывальны тэкст з цыкла „Музыка з кайфам" падумала я прысвяціць гурту з Падляшша. Штораз менш гуртоў рашаецца выступаць на беларускай мове, таму і канцэрты нашых, мясцовых герояў становяцца рарытэтнымі. Сёння раскажу пра гурт, які з аднаго боку здаецца быць маладым, з другога — пару гадоў працуе ўжо зусім сур'ёзна. Будучыні ніхто не ведае, таму раскажу пра тое, што адбываецца.

У час сёлетняга Фестывалю „Басовішча" гурту „5сот5" споўнілася пяць гадоў. Многа гэтых пяцёрак, але ў асноўным менавіта столькі асоб зараз складае гурт. Назва пайшла аднак з моманту першага канцэрта, які адбыўся якраз у 505 гадавіну заснавання Гарадка. Самае цікавае, што ў ролі вакаліста выступіў тады Андрэй Паплаўскі, заадно вакаліст гурту „Rima". Гэта быў дэбют. Пазней вакалісты мяняліся, але з 2005 года састаў музыкаў захоўваецца. У гэтым жа годзе гурт узяў узнагароду ў час „Басовішча" як адзін з конкурсных выступоўцаў. Далей было ўжо менш складана, калі ідзе пра выступы, канцэрты, але было і цяжка ўтрымаць напружанасць працы, як гэта звычайна бывае ў выпадку гуртоў, якіх члены на рэпэтыцыі з'язджаюцца з розных гарадоў.

Вызначыць жанр гурту справа нялёгкая. Цяжка акрэсліць музыку памежжа, а такой менавіта з'яўляецца творчасць „5сот5". Прагрэсіўны рок мяшаецца з металам, часам можна пачуць матывы інды-рока, а ўсё гэта прыпраўленае жаночым вакалам. Пры большасці песень танцуецца цяжка, але прынамсі ёсць чаго паслухаць. А калі гаворка пра музыку, то варта дадаць, што ў мінулым годзе гурт запісаў свой дэбютны альбом „X".

Вельмі важнае, што гурт працуе ў Гарадку, і то па некалькіх прычынах. Перш за ўсё падкрэсліваецца значэнне Гарадка, дзе ўжо васемнаццаць гадоў ладзіцца Фестываль „Басовішча", як месца спрыяльнага развіццю альтэрнатыўнай культуры, асабліва ў выпадку музыкі ды жывапіснага мастацтва. Адчуваецца там нейкая спецыфічная атмасфера, калі прыедзеш у Гарадок, калі зойдзеш у славуты дом культуры на канцэрт ці рэпетыцыю аднаго з рок-гуртоў. А атмасферу ствараюць перш за ўсё маладыя людзі, якія граюць, якім неабыякавая лакальная культура. Такім чынам і „5сот5" захоўвае яе ў мове ды ў сваёй назве.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 30

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 26:

Мосцік, ружа, рэдакцыя, пара, кнот, на, тры, ода, ты, этан. Рэпа, вуда, жарты, Макар, смык, янот, ода, стан.



Ева СЦЕПАНЮК

Фота Аляксандра Вярбіцкага

Няма дурных!

Трое апошніх сутак Тодар Канаплюк не еў. Ён сядзеў ля акна галодны як воўк і дзікім зрокам узіраўся ў брук. Час ад часу, калі на мазгі налятала балючая млоснасць, ён пруцянеў бы мярцвяк і адчуваў як калышацца вуліца за акном. Здавалася, паасобныя камяні ўзлятаюць угару, гопаюць як мячыкі і назад цаляюць у сваё месца. Іншы раз яго дарога паўставала ўспененай жоўтарудой ракой, па якой плавалі дохлыя акуні. Раз брукаванка паказалася трактам, вымашчаным людскімі чарапамі. Сярод іх Тодар бачыў сваю акрываўленую галоўку. Апошні прывід чамусьці не палохаў будучую ахвяру. Наадварот, уяўны пах крыві, які з'яўляўся разам з чарапамі, наклікаў доўгачаканы кайф. Канаплюк жмурыў вочы і бяззубымі дзяснамі перажоўваў прывідныя смакоцці. Здавалася, ён разам з бацькамі рассеўся за велікодным сталом, застаўленым па берагі каўбасамі, кумпякамі, паляндвіцамі і пірагамі, аздобленымі каляровымі гарошкамі...

У Н. шкадуюць, што Тодар Канаплюк не памёр ад голаду.

* * *

Мёртвага Тодара з абдзёўбаным да касцей тварам знайшлі пасля двух тыдняў ад знікнення. Пра гэтае здарэнне кружыць ужо процьма супярэчных версій.

Аляксандр К., які *ведае найлепш,* даказвае, што мерцвяка найшлі ў жыце. Параска К., якая *ведае ўсё на свеце,* упэўненая, што ахвяра ляжала ў прыдарожным рове між Курашавам і Лядамі. Харытон Г. сам не бачыў, аднак ведае, што Канаплюка з абрэзанай галавой пабачылі ў квітнеючым рапсе. Суседка Тамара К., якая раней распавяла пра апошнія прывіды нябожчыка, даказвае, што *бедненькага* найшлі на апусцелым хутары. Меў ён, няшчасны, сканаць у пакутах як Хрыстос, прывязаны да бетоннага слупа. Чатыры бетонныя слупы, што асталіся ад разваленай стадолы, добра відны са згаданай дарогі...

— А мой сын чуў яшчэ *іншую* праўду, — дадае Тамара. Паводле апошняй версіі труп з галавой, захутанай у фольгавы мяшок, меў плаваць у рэчцы пад мостам. Мярцвяк не паплыў з цячэннем ракі, бо зачапіўся мяшком аб вербалоз ці альшыну...

У гэты момант наш чытач мае права ўсхвалявацца. Чаму ўся ўвага нашых апавядальнікаў накіраваная ў такі бок — у тупік? Чаму не шукаем вінаватых? Не абіваем парогаў ахоўнікам правапарадку, не абуджаем абыякавых сумленняў нашага грамадства?!

Але ў Н. няма дурных.

— А хто там будзе праўду шукаць, — махае рукой Аляксандр К. Дзядзька дадае, што мярцвяк быў апошнім з роду Канаплюкоў.

* * *

Мы таксама не мелі намеру шукаць праўды і вінаватых. Доза абыякавасці і страху, якім пачаставалі нас у Н., зрабіла сваё. Каб аддыхацца ад ментальнага тупіка, мы рушылі следам айчынных паэтаў проста ў абдымкі прыроды. Карацей, мы прыселі ў цяньку ля старой ліпы і патаналі ў паніхідным настроі вёсачкі. Час ад часу брукаванкай праходжваўся худы кот. Ад загумення даносіўся спеў жабы-квашкі. Мы ўяўлялі сцэну з могілак, калі ў спеху і гарачцы пахавальная фірма засыпала зямлёй апошняга з роду Канаплюкоў. У той спякотны ліпеньскі дзень з неба тройчы абрываўся лівень. Па Канаплюку ніхто больш не плакаў. Усе *прыпадобныя,* з якімі новапрадстаўлены Фёдар меў прагуляць нажытае бацькамі дабро, замест на могілкі пацягнулі ў хваіну. Бо якраз *аказія* была, лісічкі абрадзілі...

— *І нават труну ў царкву не ўносілі,* — гучалі ў вушах пачутыя справаздачы з паховін, — *каб сярэдзіну не смуродзіць...*

Мы ўжо раней заўважылі элегантны еўрарамонт у нашай старэнькай царкве. Праўда, не ўсім даспадобы прыйшоўся новы інтэр'ер. Нам таксама шкада блакітнай столі з залатымі зоркамі, якую рэстаўратары замалявалі белай фарбай. Цяпер наша царкоўка чуць не касцёл. Ды наш бацечка напамінае гаварыць яму: *прошэ ксендза!* Каб усе ўсіх разумелі і кахалі, каб усё было ясна і зразумела!

Дзякуючы нашай парафіяльнай логіцы, мы таксама зразумелі чаму ў Н. размножыліся і пераблыталіся месцы з трупам у цэнтры. Гэта не жарты і не гульня ў словы. Цягам апошняга года тут знайшлі яшчэ двух мярцоў, самотных кавалераў. Адзін з іх меў гніць пад мостам з фольгавым мяшком на галаве, другі ляжаў акрываўлены ў рове. Ніхто не шукаў праўды ані вінаватых...

* * *

Тодар Канаплюк нікому не перакасіў і не перааараў. І таму яго найбольш шкадуюць з ліку загінуўшых у таемных абставінах. Пасля смерці бацькоў хлапец папаў у анарэксію.

— Бо то такі быў чалавек, што і гарбаты не ўмеў сабе згатаваць, — цягне суседка Тамара. — І рукі да ніякай работы не прыставалі. — За усё сваё ўжо немаладое жыццё суседка не пабачыла Канаплюка з касой або з граблямі. — Адно што любіў, дык па грыбы як апантаны лётаць. Аж злосць часам брала. Зойдзеш у хваіну, а там бэткі ўжо павыбіраныя.

— А што ён рабіў з гэтымі бэткамі?

— Тое, што ўсе, — чуем у адказ, — прадаваў за самагонку.

У Н. шкадуюць, што Канаплюк не памёр па-хрысціянску, значыць, ад голаду.

— У дзень, калі яго апошні раз бачылі ля акна, хлапец меў схадзіць разам з сябрамі ў сваю гміну *па дары.* Па макароны, кансервы, сыр, старыя шведрыкі... — удакладняюць у Н.

Нам было вельмі прыемна, калі ў пэўны момант тры таемныя смерці зліліся ў адзін ручай абыякавасці. Далей пачыналася страсная гутарка пра дармовую ежу і адзежу. І вельмі захапілі нас асцярожныя тлумачэнні кампаньёнаў пакойнага Канаплюка. Гэтыя смяяліся ў вочы і даказвалі, што памятаюць толькі дарогу ў адзін бок.

Дом

Васілю Быкаву

Віталь ВОРАНАЎ

І восень, і дарога былі доўгія. Шлях цягнуўся як тыя шэрыя восеньскія вечары — марудна і, здавалася, бясконца. Смоўж вяртаўся дадому. Ён адолеў немалы шмат дарогі і быў ужо цалкам знямоглы, але, не зважаючы на стому, працягваў паўзці. Нечакана для сябе ён убачыў на дарозе Багоўку, якая апусцілася, каб трошкі перадыхнуць пасля палёту.

— Здарова, Багоўка! — кінуў Смоўж.

— Здароў! — адказала Багоўка. — Куды ўжо паўзеш?

— Вяртаюся дадому. Але дарога надта доўгая, — сумна сказаў Смоўж.

— Пф! — пыхнула Багоўка. — Дадому. А чаго ты палез куды не трэба. Вось я маю крыльцы, цяпер тут, праз момант там. А чаго табе, які ледзь кратаешся, было ў такую дарогу лезці?

Не чакаючы адказу, Багоўка распрастала крыльцы і ўзбілася ў паветра. Смоўж адно праводзіў яе сумным позіркам і пацягнуўся далей. Але не прапоўз ён і трохі як насупраць яму з зямлі вылез Чарвяк.

— Здароў, Чарвяк! — павітаўся Смоўж.

— Здароў, Смоўж! — адказаў Чарвяк. — Куды цягнешся?

— Вяртаюся дадому. Але дарога надта доўгая, — сумна сказаў Смоўж.

— Ха, ха, ха! — разышоўся смехам Чарвяк. — Куды цябе панясло? Дома трэба было сядзець. Вось я пракапаюся хоць-дзе да свайго дому, а табе з такім тэмпам куды ўжо было выпраўляцца?

— Але... — не паспеў азірнуцца Смоўж, як Чарвяк ужо знік з вачэй. Ён зарыўся назад у зямлю. Смоўж апусціў галаву і папоўз далей. Аднак шмат не прапоўзшы, ён убачыў, што на павуцінцы каля дарогі, замёршы, вісіць Павук.

— Здароў, Павук! — паздароўкаўся Смоўж.

— Здароў! — адказаў Павук. — Куды паўзеш?

— Вяртаюся дадому. Але дарога надта доўгая, — сказаў цалкам засмучаны Смоўж.

— Аяяяй! — заайкаў Павук. — І чаго цябе папёрла ў такую далеч? Ну іншая справа я — дзе б не быў, там дом узводжу. Вось глядзі, — і, кажучы, Павук пачаў імгненна спавіваць ніткі, якія цудоўнымі карункамі клаліся ў вялікі прыгожы ўзор. Хутка перад вачыма Смаўжа была ўжо самая шыкоўная на свеце павуціна, а на ёй спачываў задаволены сваёй працай Павук. — Вось бачыш, — з высака пачаў Павук, — і вокам ты не паспеў міргнуць, а я хату ўжо паставіў. А табе ўжо куды там...

Не паспеў Павук дагаварыць да канца, як з усяе моцы грымнуў гром, ажно ўся зямля навокал задрыжэла. З неба пачалі падаць кроплі, спярша адна, потым дзве, а за імі абарвалася цэлая зліва. Смоўж пабачыў як вялікія што гарошыны кроплі дажджу прабіваюць Павуковую павуту, і як той паспешна ўцякае, каб схавацца ад дажджу ў прыдарожнай траве. Амаль у той жа момант Смоўж пабачыў як таропка ападае долу прамоклая Багоўка, і як шпарка паўзе, каб знайсці месца, дзе можна перачакаць буру. Раптам зямля пад Смаўжом заварушылася яшчэ мацней, але гэтым разам не ад грому. Гэта Чарвяк спешна выкідаў наверх размытую гразь. Чарвяк выцягнуўся з зямлі і залез у траву дзе, збіўшыся ад холаду і макрэчы, ужо сядзелі Багоўка і Павук.

Смоўж глядзеў на гэты вэрхал сваімі выстаўленымі вонкі рожкамі і сам сабе пасміхаўся. Ніводная кропля дажджу не прабівала ягонай хаткі. Смоўж зразумеў, што дзе б ён не быў, ён заўжды дома.

2003

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Ліпаман і чары Падляшша

Тамаш Ліпаман родам з Мазавецкай зямлі. Ад гадоў на Беласточчыне. Прыязджаў сюды ад ранніх васьмідзесятых, а жыве ад 1994 г. Біёлаг, бадзяга па свеце, падарожнік, арганізатар турызму, гід, аўтар блогаў пра прыроду. Першы раз я ўбачыла прозвішча гэтага навукоўца дакладных навук у штомесячніку... „Варожка", дзе друкаваліся ягоныя рамантычна-фантастычныя допісы з нашых бакоў, а падпісана было, што аўтар жыве ў Белавежы. Адкуль зацікаўленне таемным светам у чалавека, які па натуры верыць у бачнае і датыкальнае? І тая закаханасць у Падляшша? Выдаў ён нядаўна ў беластоцкім выдавецтве „Крэатар" кнігу „Легенды Падляшша". Мабыць, па бабулі ён мае таленты і зацікаўленні? Ды ягоная дваюрадная бабця Ірэна Окунь, якая так любіла з пляменнікам цягацца па лугах і пустынях, распавядаючы яму розныя жахліва-цікаўныя гісторыі пра вадзянікоў, лесуноў, ведзьмаў ды тапельнікаў, не была знахаркай-вядунняй, а настаўніцай гісторыі, якая працавала ў архіве старых актаў. Тамаш Ліпаман стаў запісваць гэтыя падляшскія цуды ў сталыя гады. І ў апошні час лічыцца „спецыялістам" па таемных сцежках



Беласточчыны. Летась ягоныя легенды былі апублікаваны ў кнізе „Міфы і легенды аб Нёмана да Буга" (у конкурсе супрасльскага згуртавання „Uroczysko" атрымаў ён спецыяльны прыз). Цяпер чытача можа захапіць эксклюзіўна выдадзеная кніга „Legendy Podlasia" — выдавецтва „Крэатар" выдае толькі шыкоўныя кнігі, ды такія, якія страт не прыносяць. Вось, можна зарабіць на свойскай экзотыцы!

— Спадабалася Вам тут, — звяртаемся да аўтара кнігі на прамацыйнай сустрэчы ў кавярні „Фама". Тут багата сабраных гледачоў цешыць таксама паказ слайдаў падляшскага краявіду Віктара Волкава. — Прырода, людзі?

— Няма цікавейшага месца ва ўсёй Польшчы! Дарэчы, людзі тут таксама „іншыя", не скажу што „лепшыя", але з імі лёгка наладзіць кантакт, пасябраваць. Ды і цікавае месца для любіцеляў прыроды. Маё хобі стала маёй прафесіяй — я цяпер з прыемнасцю паказваю наша Падляшша як гід, ствараю даведнікі таксама ў інтэрнэце.

— Кніга пра легенды Падляшша гэта таксама своеасаблівы даведнік. Здаецца, вы тут ад пакаленняў — настолькі добра ведаеце ваколіцы і адчуваеце дух месца і людзей.

— Класічны даведнік здаецца быць цалкам сухім, нерамантычным. Я выдаў раней даведнік „Скарбы Белавежы", даўшы яму форму кароткага рамана.

— У звычайным даведніку аўтар абяцае паказаць чытачу і будучаму наведвальніку тое, што варта пабачыць. У такім жа ж не гарантуе сустрэчы з духам, лесуном, дзівам! Ці вы гарантуеце ў сваёй праграме сустрэчу з такімі дзівамі на экскурсіях, якія водзіце па Белавежы?

— О, для гэтага трэба часу і цярпення! Я гэтага не гарантую. Вадзянік — стварэнне палахлівае, хітрушчае, асцярожнае, не прыбяжыць жа ж на час, мусім яго і звабіць. Самому трэба таксама сцішыцца, пачакаць, параздумваць. Вядома, не гарантую такіх экстравагантных сустрэч з істотамі, якія па сваёй натуры патойбаковыя. Хочацца ў доўгія зімовыя вечары пачытаць пра незвычайнае ды таемнае. Сустрэча ж сапраўдная з такімі істотамі магла б кончыцца не зусім прыемна. Лепш пра такое пісаць, чым адчуць на ўласнай скуры.

З Тамашом Ліпаманам можна сустрэцца не толькі на экскурсіях, але і ў сеціве: *www.bialowieza.com.pl; www.przyrodapolska.pl; www.zielonetechnologie.pl*

ТАМАШ ЛІПАМАН

Пунсовая карчмА

Ёсць на ўсходніх ускраінах Кнышынскай пушчы мястэчка Крынкі. Сёння яно хутчэй сціплае. Аб былой знакамітасці гэтага гарадка можа сведчыць герб — грыф ды легенда з пачаткаў пятнаццатага стагоддзя. Легенда звязана з адным з найвялікшых польскіх уладароў ды маладзейшай ад яго на пару ладных дзесяткаў гадоў каралевай Ядвігай. Шматгалосая плётка распавядае, што ў час, калі Пушчу шматліка насялялі собалі, ваўкі, мядзведзі і расамахі, а людзей і шляхоў было няшмат, кнышынскімі бездарожжамі з Літвы ў Кракаў вандраваў князь разам са стражай вояў. Той атрад у дарозе ў Кракаў загразе у багне ў ваколіцы сённяшніх Крынак. Для пераправы збудавалі часовы мост, а для лепшага прыёму ў Кракаве забралі згэтуль мясцовую жывую ваду.

Вада з мясцовай крыніцы аздаравіла Ядвігу, за што пазнейшы пераможца Грунвальдскай бітвы, згодна логіцы эпохі, падараваў князю гэтыя землі.

За праўдзівасцю легенды прамаўляе факт, што Ягайла, як кароль Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, наведаў Крынкі ў 1434 годзе, аднаўляючы тут еднасць Літвы з Каронай.

Міналі гады, гасла дынастыя Ягелонаў, а разам з ёю патухала знакамітасць Рэчы Паспалітай. Уманская разня была прэлюдыяй Таргавіцы, звязанай з патранатам Кацярыны II, якая, як вядома, выцерла Польшчу з карты Еўропы. У той цяжкі час праз Крынкі прабягаў важны гандлёвы шлях з Гродна ў Бярэсце над Бугам і далей у Кракаў. Рускія, польскія ды нават і венецыянскія купцы вандравалі гасцінцам праз Крынкі, Белавежу, Камянец, везучы розны тавар, між іншым золата ды дарагія каштоўнасці.

Ля тракта дзейнічала аўстэрыя, якую вяла сям'я Лейбніцаў. Велікаваты драўляны будынак з аркадамі, накрыты мансардавым дахам і падперты ад фронту разным ганкам, стаяў некалькі вёрст на захад ад Крынак, пры шляху ў Гарадок. Невядома, калі збудавалі гэты шынок, аднак падзея з канца XVIII стагоддзя, звязаная з гэтым месцам, да сёння жыве ў мясцовай легендзе. Карчму вёў, не горш і не лепш за сваіх продкаў, Мошэ Лейбніц. Штосьці яго, аднак, вылучала з ланцуга генаў — дачка Рахіля, дзяўчо вялікай красы. Валасы як бяззорная снежаньская ноч, вочы як у ялавіцы, поўныя вусны колеру спелых малін, зграбны невялічкі нос, твар колеру старога золата, грудзі стромкія, вузкі стан, попка як у кабылкі-двухгодкі, ножкі бы ў сарны. Адным словам — кроў з малаком.

У той неспакойны час бушаваў у ваколіцы Мацей, паўсюдна званы Расамахам. Прафесійна займаўся ён, няшмат гаворачы, разбойніцтвам. Абдзіраў галоўным чынам купцоў. Рабаваў без пакарання, паколькі каралеўская ўлада сюды не сягала. Слова добрага аб ім не скажаш. Дзікія вочы, ускудлачаная барада амаль па пояс дый адзенне паскуднае — усё адпаведнае паводзінам.

У час адной з папоек, якімі гэты бандзюга з любасцю аддаваўся ў гасподзе Мошэ Лейбніца, трапіла яму ў вока Рахіля. Бацька дзяўчыны не хацеў дачку выдаць замуж за бандыта, да таго гоя. За сваю ўпартасць аддаў жыццё. Пры такой шлюбнай прапанове дзяўчыне цяжка было даўжэй адмаўляцца. Пасля вянца, які, кажуць, сам Барута даваў маладой пары, Расамах рашыў „пасталець". Нейкі час вёў спакойна інтарэсы. Раптоўная натура, неўтаймаваная пагарда да паўсюдна абавязваючых нормаў, а асабліва прагнасць маладажона ўзялі аднак неўзабаве верх, паклаўшы канец досыць пачцівай экзістэнцыі.

Расамах пачаткова хацеў нават вярнуцца ў лес, на рабаўніцкі шлях. Абдумаўшы справу, дайшоў ён да вываду, што няма сэнсу ганяцца за звярынай, калі яна сама трапляе яму ў рукі. А звярыны хапала. Калі спыніліся напады на гандлёвым шляху, купцы штораз больш людна цягнулі з Гродна ў Бярэсце і далей у Кракаў. Госці ставалі ў карчме „Пад чырвоным пеўнем", славутай добрай кухняй, каб больш не ўстаць. Жорсткі гаспадар забіваў у сне кожнага багацейшага госця, а іх пасечанымі целамі карміў свіней, бо ж, як я ўжо казаў, быў вялікім скупечам. Мясцовыя называлі паціху гэты змрочны заезд „Пунсовай карчмой". Прыезджых, аднак, не асцерагалі перад смяртэльнай небяспекай тэрарызаваныя Расамахам, які меў за нішто ні чалавечы, ні боскі закон.

Працягваўся гэты ганебны промысел некалькі гадоў. Карчмар сабраў вялікае багацце, якое, кажуць, закопваў у склепе — складзе віна.

Аднойчы спынілася ў гасподзе Малгажата, блакітнавокая ўдавіца з парай малалетніх сыноў. Абяднелая з-за шматгадовай судовай валакіты шляхцянка кіравалася ў Кракаў, каб выпрасіць у Яго вялікасці караля ласку для сябе і дзяцей, пакрыўджаных мясцовым правасуддзем у шматгадовым спрэчцы з хітрым і багатым суседам. Уся маёмасць жанчыны гэта была худая калітка з грашыма на далёкае падарожжа ды выпрашэнне прыхільнасці каралеўскіх шаптуноў.

Расамах прыкмеціў і ўдовін грош. Ветранай, цёмнай, снежаньскай ночу закраўся ў сціплы пакойчык на паддашку, узброены ў азіяцкі кінжал.

Трэба вам, аднак, ведаць, што ноч гэтая была асаблівая, ноч зімовага сонцастаяння. Для шматлікіх еўрапейскіх народаў гэта нагода да святкавання адвечнага цыкла натуры. Якраз у гэтую ноч прыпадае адзін гэтак званы малы сабат, свята чараўніц, званае Юле. У той час адпраўлялі яны магічныя абрады, прамаўлялі заклінанні, танцавалі ў бляску месяца, выклікалі таемныя моцы, кантактаваліся з духамі памерлых.

Усё ж, наша гісторыя здзяйсняецца, гляньце, у больш за восем стагоддзяў ад хрышчэння Польшчы! У бледным сяйве месяца жорсткі гаспадар крадзецца да ложа ўдавіцы і яе сыноў. Крывы кінжал уздымае да смяртэльнага ўдару. Роспачны крык Рахілі падымае павекі Малгажаты. Маці глядзіць проста ў зрэнкі Расамаха.

Енкнула зямля, схілілася голле ясеняў, што цесным вянком акалялі падворышча „Пунсовай карчмы". Заскрыпелі бэлькі сцен, сыпануўся пыл са столі. Жанчына сарвала з ложа дзяцей, піхнула дзверы і збегла па стромых усходах. Расамах застаўся ў пакойчыку. Знерухомелы, здзіўлены, у чаканні. Уздыхнула зямля, раскрылася і праглынула аўстэрыю.

Мясцовыя кажуць, што там, у некалькіх вярстах на поўдзень ад Крынак, паміж Плебановам і Азяранамі, у снежаньскія ночы Барута, які быў, мабыць, Расамаху маршалкам на вяселлі, выносіць з зямлі золата. Выносіць, каб правеялася. Кажуць, у некаторыя зімовыя ветраныя ночы відаць у полі жоўтыя агеньчыкі, якімі палаюць скарбы забітых вандроўнікаў. Колькі ў гэтым праўды, цяжка дайсці, факт аднак застаецца фактам, што амаль сто гадоў пасля гэтых падзей, пра якія я вам расказаў, адзін пробашч спрабаваў адкапаць закляты скарб. Магілы гэтага духоўніка дарма шукаць на мясцовых могільніках. Засталася толькі назва вёскі: Плебанова.

Палац майго дзяцінства

Пётр БАЙКО

Калі чалавек паволі набліжаецца да канца свайго жыцця, штораз больш і часцей азіраецца назад. Задумваецца над сваім жыццём, над яго сэнсам. Пералічвае свае дасягненні і паражэнні. Але ўсё ж найахвотней вяртаецца думкамі ў сваё дзяцінства — калі ўсё было табе цікавае, калі пачынаў пазнаваць свет, калі не меў большых турбот, калі жылі бацькі і гэтак далей. Я ўжо гэта „перарабляю". Першы вобраз, які мне прыходзіць на думку — гэта залітая сонцам вуліца, на якую выбягаў я разам з іншымі дзяцьмі пагуляць. І хаця кожны з нас, вясковых хлапчукоў, меў абавязак дапамагаць бацькам дома або ў полі, то ўсё ж такі знаходзіў час на сяброўскія гульні.

Другі вобраз, які мне запамятаўся з дзяцінства — гэта руіны царскага палаца, які, па волі цара Аляксандра III, збудаваны быў у Белавежы ў 1889-1894 гадах. Палац гэты быў падпалены падчас адступлення немцаў з нашай тэрыторыі ў ліпені 1944 года. Асталіся адно руіны, якія можна было адбудаваць, але ўсё-такі знайшліся людзі, якія давялі да іх разабрання. Галоўным чынам сталася гэта ў 1961 годзе, калі мне было 11 гадоў. Так, што на маю долю выпала яшчэ магчымасць пааглядаць руіны палаца і пагуляць у іх, а малодшым за мяне — толькі палюбавацца выглядам палаца на здымках.

Фота ЯНА САВІЦКАГА

Мой дваюрадны брат Ежы Бэлзэцкі з Гайнаўкі (злева) і я на фоне руін белавежскага палаца ў красавіку 1960 года. Восем месяцаў пазней палац пачнуць разбіраць

Нас, дзяцей, палац проста ачароўваў. Мы часта бегалі ў палацавы парк, каб пагуляць пасярод руін. Пры нагодзе выдзіралі мы металалом і прадавалі яго на скупцы. У такі спосаб пачыналі мы самастойна зарабляць свае першыя грошы. Заглядалі мы ў розныя памяшканні палаца, улазілі неяк па зруйнаваных сходках на паверх, заглядалі ў падвалы. Найбольш запамяталася мне памяшканне ў падвале, дзе захоўвалі віно. Віна, вядома, там ужо здаўна не было, але асталіся незвычайныя сцены, выглядам напамінаючыя рамкі ў вулеі. Мы, вядома, прабавалі адшукаць у друзе нейкія бутэлькі з віном, але без рэзультату. Прабавалі мы таксама адшукаць і „царскі скарб", якога ўсё ж нам ніколі не ўдалося знайсці, бо ніхто яго тут і не схаваў, хаця мясцовыя людзі распавядалі аб ім розныя неверагодныя гісторыі.

Свабодна бегаць пасярод руін мы не маглі. Іх пільнавалі паркавыя вартаўнікі, якія заўсёды адтуль нас праганялі. Але хто там калі ўпільнаваў падлеткаў? Дастаткова, каб вартаўнік адышоў на хвіліну ў другі бок парку, а мы ўжо ўсёй групкай ускоквалі ў падвал. Найбольш строгім вартаўніком быў Мікалай Кічкайла, але ён, ходзячы пры дапамозе палачкі, не меў шанцаў кагонебудзь з нас злавіць.

Калі наступала нядзеля або выпадала нейкае свята, белавежцы ахвотна выбіраліся на шпацыр у палацавы парк. Пры гэтай нагодзе выконваліся памятныя здымкі, найчасцей на фоне руін. Таму руіны палаца дасканала абфатаграфаваны і здымкі з імі захоўваюцца амаль у кожнай белавежскай сям'і.

А калі прыходзіла зіма, мы, дзеці, агромнай чарадой бегалі на „Палацоўку" катацца, значыць на ўзгорак, які цягнуўся ад палаца ўніз аж да сажалкі. З'язджалі хто на санках, хто на лыжах ці каньках, а хто і на сваім азадку. Узгорак гэты па сённяшні дзень усе называюць „Палацоўкай", а дзеці, як раней маё пакаленне, надалей выкарыстоўваюць яе як месца зімовых гульняў.

Наведваючы руіны, мы заўсёды ўяўлялі сабе як было тут у царскі перыяд. Наша ўяўленне дасягла неймаверных узвышшаў. Часам усім нам здавалася, што зараз з-за вугла выйдзе сам цар ці царыца. Але найчасцей адзываўся вартаўнік Кічкайла: „Вас ізноў сюды прынясло!?" І мы вокамгненна вярталіся ў нашу рэчаіснасць. Не перавялічваючы, мы, белавежскія дзеці, былі вельмі ганарыстыя з таго поваду, што ў нашай мясцовасці існуе палац, хаця б і ў выглядзе руін. Добра мы ведалі, што ніводная навакольная мясцовасць не мае такога скарбу. Мы ахвотна вадзілі прыезджых сваякоў-аднагодкаў і паказвалі ім нашу жамчужыну.

Прайшлі гады — няма ўжо нашага палаца, няма таксама на гэтым свеце ўжо і некаторых маіх сяброў з дзіцячых гадоў. Асталіся адны ўспаміны. Чалавек вяртаецца думкамі да свайго шчаслівага мінулага як да гаючай крыніцы.

Існуе ў Беларусі радыёстанцыя падобная нейкім чынам на „Голас Амерыкі" ці „Нямецкую хвалю". Праўда, падабенства тут больш колькаснае, чым якаснае. Гэта значыць, што распаўсюдзіць сваё вяшчанне беларуская радыёстанцыя, таксама як і замежныя аналагі, імкнецца на большую колькасць краін, пры гэтым, аднак, распавядаючы больш не пра сваё асэнсаванне глабальных падзей, а толькі пра беларускія навіны. Завецца такая радыёстанцыя „Беларусь", што больш за сорак гадоў таму была створана для вяшчання для беларусаў замежжа.

Зразумела, ахапіць цэлую планету радыёстанцыі „Беларусь" пакуль цяжка. Разам з тым імкненне ёсць. Так, з 2006 года яна пачала вяшчаць на польскай мове, а да таго — з 1998 — на рускай і англійскай, а яшчэ раней — з 1985 — на нямецкай. З верасня мінулага года перайшла на кругласутачны рэжым вяшчання і, як сведчаць кіраўніцтва радыёстанцыі, да іх хваляў прыслухоўваюцца жыхары 37 краін свету, аб чым сведчаць дасыланыя ў рэдакцыю лісты.

Для тых, хто па розных прычынах не можа пачуць пазыўных радыёстанцыі „Беларусь" праз радыёпрыёмнік, ёсць магчымасць зрабіць тое ж самае дзякуючы інтэрнэту. Для гэтага трэба зайсці на сайт „Беларусі", што месціцца па адрасе http://www.radiobelarus.tvr.by.

Зроблены ён без перабольшання вельмі якасна і проста. З левага боку пад назвай сайта месцяцца выйсці да розных моўных версій. Мовы — тыя, на якіх вядзе вяшчанне радыёстанцыя „Беларусь" — беларуская, руская, польская, нямецкая і англійская. Тое, што беларуская моўная версія пазначана чырвона-зялёным сцяжком не мусіць выклікаць непаразуменняў — радыёстанцыя „Беларусь" з'яўляецца ўрадавай установай.

Пад шапкай сайта месцяцца і выйсці да ягоных рубрык. Менавіта тут распавядаецца аб некаторых асаблівасцях радыёстанцыі ў аднайменнай рубрыцы. „Вяшчальная сетка нашага эфіру сёння — гэта 16 гадзін эфірнага вяшчання і 10 гадзін інтэрнэт-вяшчання ў рэжыме рэальнага часу штодзень, — пішуць яе супрацоўнікі. — У праграмах радыёстанцыі: выпускі навін і інфармацыйна-аналітычныя выпускі; радыёсустрэчы з дзяржаўнымі, палітычнымі, грамадскімі і рэлігійнымі дзеячамі; вучонымі, пісьменнікамі і музыкантамі, майстрамі мастацтва і народнай творчасці; спартсменамі; праграмы пра гісторыю, культуру, духоўныя каштоўнасці беларускага народа. Паказваючы розныя аспекты жыцця дзяржавы, мы стараемся надаваць увагу і звычайным штодзённым клопатам беларускай сям'і, радавога грамадзяніна. Прыярытэтны накірунак музычнай палітыкі — папулярызацыя найлепшых узораў народнай, класічнай і сучаснай беларускай музыкі".

Усё нібыта зразумела, незразумелым застаецца час вяшчання, які супрацоўнікі „Беларусі" чамусьці называюць мясцовым. Іхнія лічбы на электронным гадзіннику на тры гадзіны адрозніваюцца ад грынвіцкіх. Беларускі час мае адрозненне толькі ў дзве гадзіны. Атрымліваецца, што радыёстанцыя „Беларусь" за мясцовы час лічыць маскоўскі.

На сайце падаецца расклад перадач, які запланаваны ў эфіры радыёстанцыі. Прычым даецца не толькі расклад эфіру на кароткіх і FM-хвалях, але і ў віртуальнай прасторы. А для тых, хто прачытаўшы гэты артыкул захацеў на ўласныя вушы пачуць, што распавядае „Беларусь", раю клікнуць на „Прамы эфір", тым самым раскрыўшы гукавую версію сайта.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Скандал за скандалам

Цэнтральнымі падзеямі ў беларускім спорце апошніх тыдняў сталі скандалы. Відаць, няладна штосьці ў гэтым каралеўстве, раз узнікаюць яны з палохаючай перыядычнасцю. Не паспела са старонак газет сысці справа пра футбольных „кратоў", як у нацыянальным чэмпіянаце выбухнула новае грандыёзнае здарэнне. Матч чарговага тура футбольнага першынства быў адзначаны фактам унікальнага судзейства. Арбітр гульні паміж „Віцебскам" і наваполацкім „Нафтанам" Сяргей Шмолік судзіў на добрым падпітку. Цікава, што гэта найбольш кваліфікаваны беларускі арбітр, рэферы ФІФА. Некаторыя пасля гэтай гісторыі сцвярджаюць, што Шмолік нават п'яны судзіць лепш, чым цвярозыя калегі па прафесіі. Толькі не судзіць, а судзіў, бо нацыянальная федэрацыя прыняла рашэнне дыскваліфікаваць Сяргея Шмоліка, а таксама інспектара матча Мікалая Мяцельскага, які дапусціў такую абсурдную сітуацыю, пажыццёва. Няма сумневу, што такі суровы вердыкт быў спушчаны з самага верху. Бо адразу пасля трагікамічнай гісторыі федэрацыя футбола „ні рыкала, ні цялілася". І толькі калі пайшоў шырокі міжнародны рэзананс — відэаролік пра тое, як п'янага арбітра выводзяць пад рукі з поля пасля гульні, быў змешчаны ў інтэрнэце і стаў адным з папулярнейшых матэрыялаў у сеціве — надышла адпаведная рэакцыя. Шмоліка па-чалавечы шкода, але ганьба, канешне, для беларускага футбола здарылася несусветная і беспрэцэдэнтная.

Другі скандал працякае больш ціха і з'яўляецца для Беларусі пасутнасці звыклай справай. Гутарка ідзе пра вельмі папулярную спартовую газету „Прессбол", якая пару месяцаў таму беспадстаўна была пазбаўлена акрэдытацыі на пекінскую алімпіяду. Хоць усім добра вядома, што больш прафесійнага і цікавага спартовага выдання ў краіне няма. А ўся прычына ў тым, што „Прессбол" абсалютна незалежная газета, якая не толькі творча піша пра ўсе галоўныя падзеі ў свеце спорту, але і выкрывае карупцыю ў многіх відах айчыннага спорту. Мяркую, „Прессбол" ужо даўно зачынілі б, яшчэ гадоў чатыры-пяць таму, але ж ужо вельмі непапулярны гэта будзе крок з боку адміністрацыі прэзідэнта. Бо па рэйтынгу прэсы „Прессбол" займае ў краіне другое месца пасля „Комсомольской правды в Беларуси".

Толькі наіўныя спадзяваліся, што „Прессболу" вернуць заслужаную і законную алімпійскую акрэдытацыю. Маўляў, умяшаецца „добры цар" і адновіць справядлівасць. Наадварот, з боку міністэрства спорту на чале з Аляксандрам Грыгаравым пайшлі татальныя абмежаванні на кантакты з журналістамі „няправільнага" і „нячэснага" выдання. Дайшло да таго, што трэнерам і спартоўцам забараняюць даваць інтэрв'ю. Частка з іх не пабаялася грознага табу і вышэй бюракратычнай забароны ставіць прафесіяналізм і элементарную чалавечую годнасць. Але ж многія, а можа і большасць, паслухмяна пахавалі галовы ў пясок, схіліліся перад чынавенскім самадурствам, якое наўпрост бесцырымонна парушае заканадаўства.

А тым часам „Прессбол" раскапаў новую „бомбу" — на чэмпіянаце краіны па лёгкай атлетыцы, дзе ішоў адбор на алімпіяду, былі фальсіфікаваныя секунды ў некаторых забегах. Працяг будзе?..

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Бурлівае пасяджэнне

11 чэрвеня ў Чаромсе адбылося пасяджэнне Гміннай камісіі развіцця і бюджэту. Абмяркоўваліся на ім, між іншым, справаздача аб ходзе рэалізацыі гміннай стратэгіі вырашання грамадскіх праблемаў, прыняцце прапаноў, вызначэнне ставак месячнай платы войту і скарга настаўніцы-пенсіянеркі Яніны Скок у Куратарыю на дырэктараў пачатковай школы і гімназіі. Калі парадак пасяджэння быў прад'яўлены пад галасаванне, тады ўзніклі спрэчкі. Старшыня Рады гміны сумнявалася ці радныя кампетэнтныя разглядаць скаргу на дырэктараў школ, паколькі была яна накіраваная ў Куратарыю. Такой жа думкі была і большая частка радных. Аднак сакратар гміны Марыя Іванюк патлумачыла: «Скарга Куратарыяй была перададзена ў гміну для разгляду ў адпаведнасці з адміністрацыйным кодэксам. Войт не можа сам яе вырашаць, паколькі дырэктары пачатковай школы і гімназіі з'яўляюцца кіраўнікамі самастойных бюджэтных адзінак. А ў статуце Рады запісана: „Рада абмяркоўвуе скаргі на войта і кіраўнікоў гмінных самастойных адзінак"». Пасля гэтага паяснення парадак быў прыняты і пачалося пасяджэнне.

Справаздачу аб рэалізацыі задач Гміннага цэнтра сацыяльнай дапамогі (ГЦСД) зачытала загадчыца гэтай установы Марыя Зіневіч. У час выступлення прывяла яна статыстычныя даныя, датычныя фінансавых сродкаў прызначаных на ўспамогу найбольш патрабуючым і на падкормліванне школьнікаў. У ходзе дыскусіі радны Сяргей Смык запытаў, ці падапечныя, якія карыстаюцца сталай успамогай, нясуць абавязак прад'яўлення дакументаў у перыядзе пазнейшага часу. Загадчыца ГЦСД заявіла, што закон не прадбачвае такога абавязку, паколькі раз прызначаная грашовая дапамога не падлягае праверцы. Войт у сваю чаргу пракаментаваў: „Павятовыя ўстановы працы часам прыцягваюць падапечнага са сталай выплатай да публічнай працы, але ў прынцыпе гэта рэдка здараецца". Радны Смык пытаў яшчэ, ці ўсе вучні, якія падаюць заявы на падкормліванне, карыстаюцца такой магчымасцю? Загадчыца ГЦСД заявіла: „Нікому мы не адмовілі".

Камісія адобрыла заявы Гміннага асяродка здароўя на атрыманне фінансавай падтрымкі пры закупцы электракардыёграфа, Кузаўскай парафіі — на пабудову царкоўнай лесвіцы, а таксама куплі паліва для службовых аўтамабіляў. Як заявіла гмінны скарбнік Міраслава Кандрацкая-Найбук, грошы на гэтыя мэты знойдуцца. Адначасова прад'явіла прапанову назначэння новай месячнай платы войту, паколькі абумоўлена гэта законам. Радны Смык прапанаваў вызначыць пасрэдную стаўку — не найбольшую і не найменшую. Войт у сваю чаргу прыкінуў: „Не хачу быць прычынай дзялення Рады". У час галасавання была ўстаноўлена агульная стаўка 7 680 зл.

На пасяджэнні абмяркоўвалася справа балансу прыбыткаў і затрат Гміннага цэнтра культуры і Гміннай бібліятэкі. Справаздачу на гэтую тэму прад'явіла скарбнік гміны. Паводле даных, дзейнасць згаданых устаноў змяшчаецца ў дапушчальных граніцах нормы. Радны Смык адно прыкмеціў, што пасля значнага рамонту будынка неабходна прызначыць адпаведныя грошы на закупку новых кніжак у бібліятэку (у якой састарэлыя кніжкі) і аднавіць абсталяванне ўнутры памяшкання.

Найбольшыя эмоцыі выклікаў разгляд скаргі Яніны Скок, настаўніцы-пенсіянеркі, якая ад імя дачкі, Гражыны Радзікоўскай, сакратаркі Пачатковай школы, і школьнага бухгалтара Ірэны Баруцінскай падала скаргу ў Куратарыю на дырэктараў школы і гімназіі. Больш за дзве гадзіны вяліся спрэчкі паміж „пакрыўджанымі" і „абвінавачанымі". Словы супраць словам. У кожнага свая рацыя. Па-мойму, няма дыму без агню. Усім у Чаромсе вядома, што ад даўжэйшага часу назіраецца процістаянне паміж двума лагерамі: Шыкулы і Врублеўскага, якія ўзніклі ў час апошніх самаўрадавых выбараў. З набліжэннем чарговых выбараў гэтыя змаганні будуць узмацняцца. Шкада адно, што гледачамі гэтага непрыемнага відовішча становяцца ні ў чым не вінаватыя жыхары пасёлка, а ў гэтым выпадку гмінныя радныя з бюджэтнай камісіі. Замест рашаць грамадскія, больш важнейшыя справы, замяняюцца яны ў судовых засядацеляў. У ходзе дыскусіі радныя адмовіліся выказваць сваю думку ў справе школьнага канфлікту. „Справай займаецца пракуратура і паліцыя. Няхай затым яны рашаюць паводле закону", — згодна канстатавалі ўдзельнікі пасяджэння. Былі прапановы палюбоўнай развязкі сваркі. Заклікалі да гэтага як пастаронні назіральнік Зыгмунт Кастоўскі, так і радныя: Надзея Суліма (старшыня Рады), Часлава Вілюк, Галена Назарук ды іншыя. А войт на заканчэнне сказаў такое: „Усё, што выходзіць з пасёлка — скандальнае! Затым вяртаецца да нас для абмяркоўвання. Я, калі даведаўся аб скаргах, як устаноўчы орган пацікавіўся справай і паміру ў абодва бакі. Мне крыўдна зараз слухаць абвінавачванні, з якімі не маю нічога супольнага. Дырэктары школы і гімназіі з'яўляюцца законнымі кіраўнікамі ў сваіх установах. Яны рашаюць персанальныя справы. На маю думку, найлепш адмовіцца ад скарг і памірыцца". Але дырэктаркі школьных устаноў і іхнія падапечныя ні словам не адазваліся. Адна толькі Яніна Скок сказала: „Справа знаходзіцца ў пракуратуры, а паліцыя вядзе расследаванне. Няхай яны рашаюць".

Набліжалася гадзіна 15-я. Час было мне збірацца дамоў да сваіх абавязкаў. Радных з камісіі развіцця і бюджэту чакала чарговая порцыя эмоцый — абмяркоўванне скаргі былога раднага Яўгена Тыханюка (непрысутнага), які шляхам папярэдніх скарг падаў заяву ў Куратарыю.

Уладзімір СІДАРУК

SMOK у Ольштыне

Пры Цэнтры ўсходніх даследаванняў у Ольштыне дзейнічае Студэнцкая міжвузаўская арганізацыя крэсавякаў (Studencka Międzyuczelniana Organizacja Kresowiaków — SMOK). У гэтым горадзе штудзіруе трыццаць чалавек з Беларусі, Літвы і Украіны, якія карыстаюцца дапамогай польскіх улад; дзевяцярым з іх стыпендыі фундуе Wspólnota Polska, некаторыя самі аплачваюць вучобу. 31 мая г.г. студэнты з-за ўсходняй мяжы, якія вучацца ў Польшчы, сустрэліся ў Ольштыне. Была гэта добрая нагода сказаць пра свае справы адным голасам.

Магчыма, што мы з'яўляемся апошнім пакаленнем, якому прыходзіцца перасякаць дзяржаўныя межы, — чытаем у прынятай заяве. — Ёсць, аднак, шмат пільных спраў, напрыклад, каб студэнты польскіх вучэльняў з постсавецкай тэрыторыі маглі, так як іх польскія сябры, карыстацца стыпендыямі за навуковыя поспехі і еўрапейскімі праграмамі міжнароднага студэнцкага абмену; такія межы, у адрозненне ад дзяржаўных, лёгка ліквідаваць.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Беларусы выйшлі на Марш у Нью-Йорку

У нядзелю, 13 ліпеня, у Нью-Йорку адбыўся Марш паняволеных народаў, які ад 1959 года праводзіцца кожны год, каб прыцягнуць увагу грамадства да праблем паняволеных нацый, якія пакутавалі і пакутуюць пад дыктатарскімі ды таталітарнымі ўрадамі, а таксама пад чужынскім панаваннем.

Сябры Беларускага моладзевага руху Амерыкі прынялі актыўны ўдзел у гэтым мерапрыемстве, каб узняць свой голас супраць прамаскоўскага дыктатарскага рэжыму Лукашэнкі, каб паказаць волю да змагання за дэмакратычную і сапраўды незалежную Бацькаўшчыну, каб прыцягнуць увагу амерыканскага грамадства да праблем Беларусі.

Маладыя беларусы і беларускі выйшлі на Марш у Нью-Йорку, каб нагадаць усім, што свет яшчэ поўны ўціску і прыгнёту, што свабода не прыходзіць сама па сабе, што за яе трэба змагацца.

www.belmov.org
www.belmovdc.org

Адгаданка

			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18	19	20	21	22	23	24	25
					26	27	28	29	30	31	32	33	34

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афрыканскую прыказку.

1. без яго дыму не бывае = 32 _ 33 _ 9 _ 31 _ 25 _;
2. навучэнец, школьнік = 20 _ 21 _ 22 _ 19 _ 18 _ 7_;
3. духоўны кіраўнік у мусульман = 1 _ 8 _ 34 _ 16 _;
4. Адам Еве = 30 _ 29 _ 10 _;
5. пашкоджанне тканак жывога арганізма = 4 _ 5 _ 6 _ 11 _;
6. адзенне святара на час набажэнства = 26 _ 23 _ 28 _ 27 _;
7. горад на захадзе Бранскай вобласці між Суражам і Старадубам = 17 _ 12 _ 13 _ 14 _ 15 _;
8. звышнатуральная падзея = 24 _ 3 _ 2 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 25 нумара

Фае, грып, Сірыя, прадзед, халва, Орша, жаль, вярба, мох, цень, пяро, мода, самаход, візір, рыкша, Чавусы.

Рашэнне: **Хвароба прыязджае вярхом, а адыходзіць пяшком.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata: IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.

Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,

Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

XIX „Басовішча” 18-19.07.08

Фота Міры ЛУКШЫ

Лаўрэаты XIX „Басовішча”:

I месца — гурт „Тлуста Луста” (Гродна) — узнагарода Беларускага аб’яднання студэнтаў, тэлеканала „БелСат” і Радыё Беласток

http://www.step.lua.pl/

Фота Міры ЛУКШЫ

II месца — гурт „Шпіталь F” (Мінск) — узнагарода Беларускага Радыё Рацыя і войта Гарадоцкай гміны

Фота Міры ЛУКШЫ

http://www.step.lua.pl/

III месца — гурт „Глюкі” (Магілёў) — узнагарода Польскага Радыё для замежжа

Фота Міры ЛУКШЫ

http://www.step.lua.pl/

http://www.step.lua.pl/

27.07 — 02.08

(22.03. — 20.04.) 28.07. — цяжкі дзень, не прымай кардынальных вырашэнняў. 29.07. — неадкладна спраўся з хатнімі справамі. 30.07. — сатанінскі дзень, канфлікты, нечаканыя навіны, змена планаў. Абмінай усё, што можа прынесці шкоду твайму арганізму. 31.07. — небяспечны, крытычны дзень, асабліва ў фінансах, страты.

(21.04. — 21.05.) Будзь вельмі асцярожны ў апошнія дні ліпеня — могуць цябе звесці ў пачуццях і фінансах. Сачы за прыкметамі — могуць цябе асцерагаць. 29.07. — непрыемнасці, мана, ілюзорнасць, непрадбачаныя выдаткі, парэзы. 30.07. не атруціся, будзь асцярожны ў тлумных месцах. 1.08. магчымае значнае дапаўненне бюджэту.

(22.05. — 22.06.) Ва ўсіх справах звяртайся да здаровага розуму. 28.07. лёс дасць табе новыя выклікі. 29.07. — дэпрэсіўныя станы. 30.07. — не выбірайся ў дарогу, не еж па-за домам, не пі спіртнога. 31.07. — крытычны дзень, рызыка, недамаганні, не натужвайся ў прафесійных справах. 1.08. лепш увогуле сядзі дома. Весткі пра прыбыткі. 2.08. будзь асцярожным з машынамі і вострым.

(23.06. — 23.07.) Лепшы ўвесь тыдзень. Ды падрыхтуйся да будучых страт ці выдаткаў. Больш часу аддай хатнім справам і сям’і, адпачывай, гуляй з жывёламі.

(24.07. — 23.08.) Цэлы і тыдзень, і месяц — сапраўды ільвіныя! Ззяеш — у прыватнасці, і ў грамадстве. Зможаш падмацаваць свае фінансы. Новыя знаёмствы — з карыснымі для цябе і мілымі людзьмі (1.08. будзь усё ж асцярожны!). 30.07. — небяспечны дзень, прыёмы і сустрэчы лепш перанясі на пасляўтра.

(24.08. — 23.09.) Дзевы заняты сваім духоўным ростам, а твая ўпартасць прынясе плён. Могуць паявіцца перашкоды, калі займаешся рызыкоўнай справай, асабліва 1.08., калі могуць цябе збіць з прыярытэтнага напрамку і прынесці шкоду (асабліва парожнія размовы).

(24.09. — 23.10.) Прыемныя дні, добра ў калектыўных справах, гармонія, поспехі. 1.08. — цяжка і небяспечна, сварліва і з благім настроем, а 2.08. — з падманам і ілюзорнасцю, лішняй эмацыйнасцю, асабліва для творчых людзей, хоць магчымы прыбытак.

(24.10. — 22.11.) Актыўныя дні. Пачуццё падтрымкі зверху. Ды і злосць, сутычкі з усім светам. Трансфармацыі, новыя весткі. 31.07. не пакрыўдзь нявіннага. 2.08. магчымы матэрыяльны поспех.

(23.11. — 22.12.) Цвярозы, памяркоўны погляд, поспехі, добры настрой, добрыя адносіны з людзьмі. Падабаешся другому полу. 31.07. — крытычна, камерцыйныя здзелкі могуць прынесці вялікія страты. 1.08. памагаюць табе ва ўсім зоркі!

(23.12. — 20.01.) 28-31.07. клопаты на працы. Цяжка ўзяць сябе ў рукі, фінансавыя ходы могуць быць нятрапныя. У старэйшых Казярогаў папсаванне настрою. Мужчынам пагражаюць прыкрасці ад нечаканага знаёмства ці вяртання старога. Плёткі. 31.07. — крытычны дзень; не бярыся за ніякія фінансавыя вырашэнні, бо магчымы нават фінансавы крах!

(21.01. — 19.02.) 27.07. — вешчыя сны. Добрыя дні для творчых прафесій. Высокі жыццёвы патэнцыял. Хоць не справішся з усімі абавязкамі, а складанасці ў каханні могуць з часам стаць балючымі.

(20.02. — 21.03.) 27.07. — адзін з самых небяспечных дзён. Варта пайсці ў храм, вечар правядзі са свечкамі. Расчараванні, фінансавыя клопаты, любоўная параза, праблемы з дзецьмі. Некаторыя прыемнасці могуць быць для цябе згубнымі. 31.07. магчымыя страты; будзь асабліва асцярожным на вуліцы!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960


Помнік Кунавіну ☞ III

Ніва
ПРА ГІСТОРЫЮ

Ганна Стахіюк ☞ IV

Спадчына

Беларускі рух у Варшаве (1900-1939 гг.) і Гальяш Леўчык

Сяргей ЧЫГРЫН

Пра беларускі рух у Варшаве ў першай палове XX стагоддзя зрэдчас у нашым друку згадвалі Пятро Ластаўка, Францішак Каравацкі, Юры Туронак і іншыя літаратуразнаўцы і гісторыкі. Але гэта былі невялікія згадкі-імгненні пра беларусаў і беларускія таварыствы ў Варшаве. І, наогул, беларускі перыяд у даваеннай Варшаве першай паловы XX стагоддзя ў Польшчы і ў Беларусі сур'ёзна і грунтоўна недаследаваны. Ён патрабуе дасканалага акадэмічна-манаграфічнага падыходу і даследавання, ды і сіламі аднаго даследчыка тут не абысціся. Да гэтага павінны мець дачыненне некалькі аўтараў. І па гэтай тэме даўно пара правесці ў Варшаве, у Беластоку ці ў Мінску навуковую канферэнцыю, каб пасля ўсе выступленні сабраць і выдаць пад адной вокладкай. Гэта неабходна не толькі нам, беларусам і беларускай гісторыі, але і дзеля гісторыі Варшавы і Польшчы ў цэлым. Бо беларускі рух і яго дзеячы ў Варшаве — гэта гісторыя дзвюх краін і нашых народаў. Нялёгкі быў пачатак XX стагоддзя для Варшавы, а тым больш ён быў няпростым для беларусаў, якія там жылі, працавалі, стварылі беларускія таварыствы, саюзы, арганізацыі. Але гэта ўсё было, гэта факт, і пра гэта трэба распавядаць сёння, каб захаваць для нашых патомкаў, для нашай агульнай гісторыі. Паспрабую і я заглянуць у беларускую Варшаву напачатку XX стагоддзя. Ну, хаця б зрабіць туды невялікую вандроўку-згадку.

Беларускае жыццё ў Варшаве хутчэй за ўсё пачало закладвацца, калі ў 1893 годзе ў Варшаўскі імператарскі універсітэт на працу прыехаў беларускі акадэмік і філолаг Яўхім Карскі. Спачатку ён працаваў прафесарам, затым экстраардынарным прафесарам на кафедры рускай і стараславянскай моў і гісторыі рускай літаратуры. Пасля прафесар выкладаў там славянскую палеаграфію, рускую дыялекталогію і граматыку царкоўнаславянскай мовы. У варшаўскі перыяд сваёй педагагічнай дзейнасці, карыстаючыся ўсеагульнай павагай, Яўхім Карскі два разы выбіраўся рэктарам Варшаўскага універсітэта — у 1905 і 1908 гадах. Адначасова з педагагічнай дзейнасцю наш вучоны праяўляў вялікую цікавасць да беларускага жыцця ў Варшаве, спрыяў гэтаму, як мог дапамагаў беларускім студэнтам. У 1908-1913 гады там было арганізавана і праведзена шмат беларускіх вечарынак. У іх прымалі ўдзел і сам Карскі, яго жонка і дзеці. Быў нават такі выпадак. Аднойчы ў Варшаву прыехаў з трупай Ігнат Буйніцкі. А напярэдадні беларуская моладзь надрукавала і расклеіла па горадзе афішу на беларускай мове. Гэта выклікала гнеў царскай паліцыі, бо дазвалялася друкаваць улёткі толькі на рускай мове і на польскай. Гэты выпадак ледзь не сарваў правядзення мерапрыемства. Але, дзякуючы Яўхіму Карскаму, усё наладзілася і супакоілася. Тады ў справе гэтых афішаў былі замешаны Аркадзь Салаўевіч і Гальяш Леўчык (Ляўковіч). Менавіта Гальяш Леўчык быў у той час адным з арганізатараў розных беларускіх спраў у Варшаве. Там упершыню ён і пазнаёміўся з Яўхімам Карскім.

Рамуальд Зямкевіч, Гальяш Леўчык, Зоська Верас, 1911 год

Гальяш Леўчык у Варшаву трапіў у 1904 годзе. Ён уладкаваўся на працу чарцёжнікам у гарадскі магістрат і наведваў лекцыі ў школе мастацтваў. За гэты час Леўчык знаходзіць у Варшаве шмат беларусаў, знаёміцца з імі, арганізоўвае сустрэчы, ладзіць вечарыны. Першая інфармацыя пра беларускую дзейнасць Гальяша Леўчыка і яго сяброў у Варшаве змясціла „Наша ніва" 1 (14) снежня 1911 года. Аўтар Саўка Бурывой (Рамуальд Зямкевіч) паведамляў, што 21 лістапада адбылася вечарына студэнтаў-беларусаў Варшаўскага універсітэта. Аўтар пісаў пра нейкага Пшчолко, які шмат „гаварыў на сцэне сьмешных казак у расейско-беларускай гутарцы", пра маленькую дзяўчынку ў пекнай беларускай апратцы, якая мовіла словамі Янкі Купалы: „Чаго нам трэба" і „Чаго б я хацеў"... Пасля пра другую дзяўчынку, якая чытала верш „Не цурайся мяне, панічок" і „Панскую ласку". Потым на сцэну выйшаў Гальяш Леўчык, якога, як апісвае аўтар, „мы ўбачылі на лаўцы хвораго, слабого, ледзь жывога мальца беларуса, у згрэбнай сарочцы, прыкрытаго старэнькай сьвітай — тып праўдзівага беларуса-мужыка. Быў то малады песьняр Леўчык Гальяш. Ён слабым голасам пад гітару прапеяў: „Мне трэба ўмерці" і апрыч таго пасьля шмат чаго дэклямаваў. Усё выпаўніў шчыра і публіцы надта спадабаўся". Далей выступаў хор, які спяваў беларускія песні.

Жывучы ў Варшаве, Гальяш Леўчык сабраў вялікую і каштоўную бібліятэку, ён калекцыянаваў усё беларускае: кнігі, паштоўкі, творы мастацтва, музычныя інструменты, маркі, фотаздымкі. На жаль, у гады Другой сусветнай вайны ўсё гэта бясследна прапала. Але гэта было пазней. А тады кожнаму беларусу Варшавы і беларусам, якія прыязджалі сюды, Гальяш Леўчык з радасцю паказваў сваю калекцыю, дапамагаў матэрыяламі ў напісанні той ці іншай працы. Хачу адзначыць, што тады ў Варшаве жыў і яшчэ адзін беларускі калекцыянер кніг і рукапісаў Рамуальд Зямкевіч (1881-1944). Ён нават быў больш заўзятым калекцыянерам і бібліяфілам, чым Леўчык. Кажуць, што Зямкевіч быў такі заўзяты бібліяфіл, што не прапускаў ніводнае старое беларускае кніжкі, асабліва, калі яна „дрэнна ляжала". У выніку ён сабраў найвялікшую калекцыю рарытэтаў, але, на жаль, і яго ўся калекцыя згарэла ў вайну. Добра, што Рамуальд Зямкевіч хоць паспеў апублікаваць некаторыя рукапісы ў друку. Не ведаю толькі, як яны мірыліся і сябравалі — два калекцыянеры, два вялікія аматары беларускіх кніг — Рамуальд Зямкевіч і Гальяш Леўчык. У пісьме да Івана Луцкевіча ад 4 ліпеня 1911 года Гальяш Леўчык пісаў пра Рамуальда Зямкевіча: „Ну і цікавы з яго, аднак, экземпляр, наколькі я мог яго пазнаць!.. Зусім ён мяне здзівіў, асабліва знаннем беларускай бібліяграфіі. Ад яго я шмат чаго даведаўся. Калі ён махлюе, ды духам не ўпадзе, і будзе ісці крэпка, то смела можна сказаць, што вялікую карысць ён калісьці Беларусі прынясе! Шкада, што нямаш яму як там у Вільні альбо ў Варшаве пакуль што аперціся, каб матэрыяльна яму было лягчэй, а то, бедны, зусім ужо вытрасся!.. Я яму крыху памог, але далей трудна! Але, здаецца, ён не махлюе, а кажа праўду..." (ЦБАН Літвы, ф. 21, спр. 260, арк. 2-3).

У 1913 годзе на курсы садоўніцтва, агародніцтва і пчалярства прыехала ў Варшаву Зоська Верас (Людвіка Войцік). Там яна пазнаёмілася з Гальяшом Леўчыкам. Аднойчы яе і Марысю Галубянку, якая жыла ў Варшаве і працавала настаўніцай у школе Вавэльбэрга, Гальяш паклікаў да сябе ў госці. „Жыў тады Леўчык на вуліцы Леапальдыны, 35, кв. 32. Кватэра была, здаецца, на трэцім паверсе", — згадвае Зоська Верас (газета „Рунь" (Літва), 3 жніўня 2000 г.). Далей Зоська Верас прыгадвае: „Пакой здаваўся вузкім, таму што ягоная сцяна была абсталявана даволі шырокімі паліцамі ад падлогі да столі. І на іх стаялі кніжкі, кніжкі, кніжкі... Сапраўды, гэта была вялікая, цікавая і каштоўная бібліятэка. Сабранае было хіба што ўсё, што выйшла з друку ў беларускай мове... Усе паліцы былі ўпрыгожаныя партрэтамі пісьменнікаў, паштоўкамі, краявідамі. Шмат што было купленае, але й шмат падараванае аўтарамі ды знаёмымі. Тыя кнігі, што стаялі ніжэй, мы з Марысяй аглядалі самі, а тыя, што высока, Леўчык здымаў і паказваў сам. Не адну гадзіну гэты занятак забраў нам. Нарэшце Гальяш сказаў: „Ну й замучыў я вас... Пара адпачыць!". Мы адмаўляліся, не жада-

працяг ☞ II

9 770546 196000

І ☞працяг ючы клопату, але былі змушаныя пагадзіцца. Пілі добра прыгатаваную гарбатку, і да яе было сёе-тое смачнае. Пасля Леўчык прапяяў нам пару песняў пад акампаніямэнт гітары. Голас меў прыгожы. Пяяў і граў умела. Развіталіся мы з ім позна вечарам".

Калі я сустракаўся з Зоськай Верас у Вільні ў 1987 годзе, то таксама запытаўся ў яе пра Гальяша Леўчыка. Пісьменніца вельмі цёпла ўспамінала пра яго. Расказала мне пра тое, як Гальяш Леўчык у Варшаве пазнаёміў яе з многімі беларусамі. Яны часта ездзілі ў Ажарова, што пад Варшавай, да беларускай сям'і Сталыгваў, якія там мелі свой дом. Памятаецца, як Зоська Верас мне згадвала і пра тое, што Леўчык лічыў сваім абавязкам ведаць кожнага беларуса, які прыязджаў у Варшаву, прыцягнуць у сваю групу, каб ён не згубіўся ў людскім моры і не забываўся сваёй мовы, як ён сам казаў. А калі беларусу не было дзе начаваць, ён клікаў яго да сябе ў маленькую кватэру на вуліцу Леапальдыны. Неяк Гальяш Леўчык завёў Зоську Верас і да Міхала Федароўскага, які прыняў іх шчыра і ветліва.

У 1919 годзе ў Варшаве арганізоўваецца Беларускі камітэт. Вакол яго хутка згуртаваліся многія вядомыя беларусы Варшавы, якія актыўна пачалі пашыраць нацыянальную свядомасць. Часопіс „Беларускі летапіс" (1938, № 4, с. 11) пісаў, што Беларускі камітэт выпісваў усе беларускія газеты і часопісы, а таксама кніжкі. З іх была створана бібліятэка. А Гальяш Леўчык быў адным з самых актыўных сяброў камітэта. У Слонімскім раённым краязнаўчым музеі захоўваецца адзін фотаздымак. На здымку фатограф зрабіў надпіс на беларускай мове лацінкай: „Беларускія валасныя старшыны Слонімскага павету Гарадзенскай губерні". У кожнага з іх маецца на грудзях медаль. На адваротным баку здымка ёсць штамп „Беларускі камітэт у Варшаві" і круглая пячатка з такім жа надпісам. Магчыма, фотаздымак у Слонім трапіў праз Гальяша Леўчыка. (Паэт быў родам са Слоніма, тут у яго была хата і вялікая калекцыя старых рэчаў, кніг, паштовак і г.д. Большая нават, чым у Варшаве. — С. Ч.). Гэта ён фотаздымак прывёз з Варшавы пасля таго, як не стала там Беларускага камітэта ў 1922 годзе. Яго дзейнасць была спынена тадышняй польскай уладай.

З 1922 да 1930 года беларускі рух у Варшаве не меў актыўнай дзейнасці. У 1928 годзе зямляк Гальяша Леўчыка — Павел Крынчык быў выбраны паслом польскага сейма па спісе, выстаўленым КПЗБ. Павел Крынчык некалі згадваў, што быў добра знаёмы з Леўчыкам. Гальяш Леўчык часам заходзіў да яго ў беларускі пасольскі клуб „Змаганьне", які месціўся ў Варшаве на вул. Маршалкоўскай, 76. Беларускія палітыкі ў Варшаве часам яму аказвалі фінансавую дапамогу.

У 1930 годзе ў польскай сталіцы ствараецца Саюз беларускіх студэнтаў у Варшаве. Разам з віленскімі студэнтамі беларускія хлопцы і дзяўчаты з Варшавы ладзяць цікавыя мерапрыемствы: выступаюць з лекцыямі, дэкламацыямі літаратурных твораў, з тэатральнымі пастаноўкамі і г.д. Праіснаваў гэты Саюз усяго тры гады і дзейнасць яго была спынена польскай уладай. Гальяш Леўчык у гэты час працуе служачым у Найвышэйшым судзе ў Варшаве і актыўна перакладае рэлігійную літаратуру метадыстаў на беларускую мову. Гэтыя пераклады з'яўляліся ў выданнях „Арфа Сіяну", „Новае Жыцьцё" і „Дух праўды". За пераклады, вядома ж, ён атрымліваў пэўны ганарар. Таму актыўнага ўдзелу ў Саюзе беларускіх студэнтаў у Варшаве ён не прымаў. Але там бываў, даваў кансультацыі, парады, выступаў перад студэнтамі.

Гальяш Леўчык (крайні справа ў капелюшы) з беларусамі ў Варшаве, 1912 год. Фота друкуецца ўпершыню

Не ўдзельнічаў Гальяш Леўчык і ў кіраўніцтве Асветнага таварыства ў Варшаве (іншыя яго згадваюць, як Беларускае культурнае таварыства ў Варшаве). Гэтае таварыства з'явілася восенню 1936 года і праіснавала да пачатку Другой сусветнай вайны. Але паэт прымаў у таварыстве самую актыўную дзейнасць. Ён часта выступаў перад сябрамі таварыства з вершамі і заўсёды спяваў свае песні пад уласны акампанемент гітары.

Беларускі гурток у Варшаве. Стаіць крайні справа Гальяш Леўчык, 1912 год. Фота друкуецца ўпершыню

Асветнае таварыства беларусаў у Варшаве, нягледзячы на няпростыя палітычныя і эканамічныя ўмовы, разгарнула вялікую і актыўную беларускую дзейнасць. Старшынёй таварыства быў Я. Гапановіч, сакратаром — П. Ластаўка. Сябры таварыства арганізоўвалі розным творчыя сустрэчы, канцэрты, вечары. Іх мэтай было стварэнне беларускіх бібліятэк, клубаў, аказанне матэрыяльнай і маральнай падтрымкі сябрам АТБ і ўсім беларусам, якія жылі ў Варшаве. Часопіс „Беларускі летапіс" (№№ 6-7, 8, 1937 г.) апублікаваў тады цікавае пісьмо беларускага работніка з Варшавы. Артыкул так і называецца „Беларускія работнікі ў Варшаве". Аўтар пісьма — Фабіян Вайцілёнак — піша: „Падаць дакладны лік беларусаў у Варшаве трудна: у кожным выпадку даходзіць ён да некалькі тысяч. Аб гэтым што беларусаў тут значная колькасць сьведчыць і той факт, што на вуліцах Варшавы часта можна пачуць беларускую мову. Сярод натоўпу людзей, праходзячых па тратуарах, мы, беларусы, пазнаём адзін аднаго якраз па мове. Вельмі скора пры гэтым завязываецца знаёмства і паўстае шчырая прыязьнь. Наймацней за ўсё нас тут лучыць у вадну цесную сям'ю родная мова...". Што датычыць асветы, дык аўтар Вайцілёнак на гэты конт вось як разважае: „Ня можна сказаць, што беларусы ў Варшаве выракліся сваёй мовы, але беларускае друкаванае слова пашыраецца слаба. Дзеля гэтага заклікаю беларусоў у Варшаве зьвярнуць увагу на беларускае друкаванае слова, каторае выходзе пераважна ў Вільні і каштуе сьмешна танныя складкі, на каторыя сяньня можа сабе пазволіць амаль кожны беларус у Варшаве... Найгорш з дзяцьмі, каторыя падрастаюць бяз школы. Сумна глядзець на тых дзяцей, якія ўжо разумеюць, што яны дзеці беларускіх бацькоў, прагнуць чытаць і пісаць у роднай мове і ня маюць дзе гэтага навучыцца...".

Тым не менш, у траўні 1937 года Сяргей Паўловіч у Варшаве пры газеце „Слово", якая выдавалася Праваслаўнай мітраполіяй, пачынае выдаваць дадатак да газеты — беларускі часопіс „Снапок". Гэта быў царкоўны і культурна-асветны часопіс з малюнкамі для дзяцей. Ён выдаваўся на 16 старонках. У ім друкаваліся творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Янкі Быліны, Максіма Танка, Ніны Тарас, Янкі Журбы, Міхася Васілька і многіх іншых беларускіх літаратараў, а таксама беларускія казкі, артыкулы аб каляндарна-земляробчых святах, народных звычаях, прыродзе, пераклады з рускай і польскай моў і г.д. Падпіска на часопіс прымалася ў Варшаве на вуліцы Парыска, 27. Адзін нумар з перасылкай каштаваў 10 гр. Гэта былі невялікія грошы. Часопіс не толькі можна было выпісваць, але і купіць у Варшаве, а таксама ў Вільні ў кнігарні „Пагоня", якая месцілася на вул. Завальнай, 1.

Часопіс „Снапок" спыніў сваё існаванне ў верасні 1939 года. Але ён усё ж адыграў пэўную ролю ў пашырэнні асветы на роднай мове, садзейнічаў фарміраванню дэмакратычных поглядаў, абуджаў нацыянальную свядомасць, прапагандаваў родную літаратуру і культуру.

У 1936 годзе ў Варшаву з Познані прыязджае беларускі спявак Міхась Забэйда-Суміцкі. Тут ён жыве, выступае з канцэртамі і спявае на польскім радыё. У свае радыёканцэрты спявак заўсёды ўключаў і беларускія песні. Вакол Міхася Забэйды-Суміцкага, кажучы сённяшнім слэнгам, тусаваліся беларусы Варшавы. Са спеваком добра быў знаёмы і Гальяш Леўчык. Бацька Гальяша быў родам з вёскі Шэйпічы, што блізу Ружанаў. У гэтай вёсцы нарадзіўся і Міхась Забэйда-Суміцкі. Спявак нават кахаў Стасю Ляўковіч — сваячніцу Гальяша Леўчыка (сапраўднае прозвішча Ляўковіч). У Варшаве землякі сустрэліся. Ім было пра што пагутарыць, каго і што ўспомніць. Аднойчы сябры Асветнага таварыства беларусаў у Варшаве наладзілі ў кансерваторыі канцэрт Міхася Забэйды-Суміцкага. Часопіс „Калосьсе" (№ 1 (10), 1937 г.) пісаў: „27.02.37 у варшаўскай кансэрваторыі адбыўся канцэрт песьні. Выступаў слаўны тэнар Міхась Забэйда-Суміцкі. З прасьпяваных ім песень, найлепш спадабаліся публіцы песьні беларускія". А Пётр Ластаўка згадваў („Беларускі каляндар", Беласток 1980, с. 148): „Пакідаючы кансерваторыю, слухачы гаварылі, што вось і беларусы маюць свайго Кепуру, а „Express Poranny" ў сваёй карэспандэнцыі пісаў 28 мая: „Цудоўныя гэтыя беларускія песні, ды яшчэ ў такім выкананні!". Прыхільна адгукнуліся аб выступленні Забэйды таксама і іншыя газеты, падкрэсліваючы, што даўно не было ў кансерваторыі такога добрага канцэрта".

Летам 1939 года сябры Асветнага таварыства беларусаў у Варшаве наладзілі сустрэчу з Максімам Танкам. На сустрэчу прыйшлі 50 польскіх літаратараў, дзесяткі беларусаў з усёй Варшавы. Вечарына, як згадвае Пятро Ластаўка ў вышэйназваным „Беларускім календары", працягвалася тры гадзіны. Максім Танк чытаў свае вершы і па-беларуску, і па-польску. У тагачаснай польскай прэсе з'явіліся артыкулы з наступнымі загалоўкамі: „Максім Танк у Варшаве", „Максім Танк — беларускі Ясенін" і г.д. Беларускі паэт тады проста зачараваў усіх прысутных сваёй паэзіяй і сваім выступленнем.

На вялікі жаль, Другая сусветная вайна спыніла працу Асветнага таварыства беларусаў у Варшаве. Міхась Забэйда-Суміцкі ў траўні 1940 года пакінуў Варшаву і выехаў у Прагу. А Гальяш Леўчык летам 1944 года цяжка хворы памірае ў Варшаве, а магчыма па дарозе з Варшавы ў Слонім.

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Праўда як гарэлка

Новае грамадска-тэхнічнае вынаходства, якім зараз з'яўляецца інтэрнэт, нагадвае грэхаспакуслівае райскае дрэва пазнання, спакусу для цікавасці, якая, як гаворыць народная мудрасць, з'яўляецца першым крокам у пекла. Вось і я, бадзяючыся па тым сусветным павуцінні, зваліўся на адну з віртуальных старонак мінскага Міністэрства абароны, прысвечаную ўліку пахавання савецкіх воінаў, ваеннапалонных і цывільных грамадзян, якія загінулі на тэрыторыі Польшчы ў час Другой сусветнай вайны; абмежаваўся я да нашага ваяводства. Пару тыдняў раней, кранаючы лік ахвяр бітвы ў пачатку вайны за мост між Бельскам і Заблудавам, выказаў я недавер да гэтага даведніка. Рашыў я тады падацца яшчэ яго следам на ваенныя подступы да Усходняй Прусіі, на рубеж ракі Сідэркі.

Найперш заглянуў я ў Крапіўна, дзе згодна згаданаму ўліку павінны быць дзве байцоўскія магілы: адна з двума невядомымі салдатамі, а другая з адным вядомым. На канцы вёскі з боку Вострава стаіць помнік сяржанту Івану Аляксееву і 74 ягоным саратнікам — лікі разыходныя з мінскім улікам...

Заглянуў я на солтысаў панадворак, зараз побач помніка. Малады гаспадар вёскі пра сляды ваеннага мінулага побач ягонага панадворка нічога змястоўнага не ведаў і накіраваў мяне да сваёй суседкі з другога боку вуліцы.

Трапіў я пад найлепшы ў Крапіўне адрас. Жанчына, цяпер пажылая і хворая, раней апекавалася ўсімі помнікамі — і вясковымі, і ваеннымі. Пра салдацкі сказала яна, што ў вайну каля Крапіўна праходзілі цяжкія баі, што каля ейнай вёскі загінула многа байцоў, прынамсі ў два разы больш чым напісана на помніку. Забітых з поля бою пазвозілі ў брацкую магілу, што побач аднаго з хутароў недалёка вёскі, а пасля некалькіх гадоў перапахавалі іх усіх на ваенныя могілкі ў Саколцы; помнік на краю вёскі паставілі яшчэ пазней.

Але перапахавалі не ўсіх. За вёскай, на мяжы між грунтамі Крапіўна і Грабова, знаходзіцца магілка, дзе спачываюць астанкі двух байцоў. Мая субяседніца, пакуль хапала ёй сіл, апекавалася той магілкай, садзіла на ёй кветкі. Бывала так, што тыя кветкі выкопвалі жыхары грабоўскіх хутароў, але адзін з іх пасаромеў сваіх суседзяў і яны перасталі абкрадаць магілку. Цяпер ёю апякуецца, здаецца, сям'я Сапкоўскіх з грабоўскага хутара. І тая менавіта магілка двойчы ўнесена ў складзены ў Мінску спісак: раз яна выступае пад адрасам Крапіўна, другі раз пад адрасам Грабова — іншых магіл у Грабове няма; у абедзвюх мінскіх рубрыках па два невядомыя салдаты.

Падаўся я далей, у Гарасімавічы; там, паводле згаданага даведніка, спачывае роўна пяцьдзесят байцоў... Зайшоў я і тут да солтыса, якому ўжо за шэсцьдзесят, які крыху ведаў пра падзеі ваеннай даўнасці, але за дакладнасць іх не ручаўся. Калі я папрасіў яго накіраваць мяне да каго-небудзь старэйшага, ён завёў мяне да сваёй маці, якой 97 гадоў і якая захавала ў памяці ваенныя падзеі, што адбываліся ў ейнай вёсцы. Вось што яна мне расказала...

— Перадавая лінія немцаў была каля двухсот метраў ад нас, у бок ракі. Немцы заселі ў акопы, а мы ў падвале, я з двойкай дзяцей: двухгадовай дачкой і паўгадовым сынам. Стала гарэць вёска — немцы падпалілі. Недалёка, на невялікім узгорку стаяў нямецкі кулямёт. Пад нашу сядзібу прарвалася двух саветаў, а немец як застрачыў, то тыя салдаты пападалі і пагарэлі. Тады згарэла ўся наша вёска, было ў ёй 75 хат, то толькі сем, крытых чарапіцай, асталося, а апошнія, пад саламянымі стрэхамі, згарэлі. Людзі сталі ўцякаць у бок ракі. І я з дзяцьмі вырвалася ў той бок, у акопы, з якіх немцы адступілі. Дабегла я да стадолы, а яна загарэлася ад савецкіх снарадаў, што ляцелі ад Дубасна. То мы ў альшыну, дзе былі канавы ад выкапанага торфу. Мы апынуліся пасярэдзіне фронту. Побач мяне сядзела жанчына з чатырохмесячным дзіцём пры грудзях — тое дзіця загінула, а куля спынілася ў пялюшках; самой маці параніла рукі. І ўцякаць няма куды! А ў канавах вада стаяла, то так кулі падалі ў ваду, быццам праліўны дождж ішоў — толькі бурбалкі ўспыхвалі. Мы да веткі белую хустку прывязалі і да немцаў папаўзлі. Схаваліся ў трэцюю лінію акопаў — побач была вялікая абора, дык мы ў ёй на саломе пад сцяной двое сутак прасядзелі. А жах вялікі быў, бо наша вёска сем разоў з рук у рукі пераходзіла. Немцы яшчэ за вёскай у жыта хаваліся і адтуль касілі савецкіх салдат. Пад вечар, другога дня баёў саветы выцеснілі немцаў ад нас. Зараз пасля баёў сусед, у якога ўцалела хатка, забраў мяне з дзецьмі да сябе; пяць сем'яў там сабралася.

Нашых вяскоўцаў загінула пяць чалавек — у адной сям'і было двух братоў, адзін быў на фронце і жывым вярнуўся, а другі быў тут і ў час бою выхіліў галаву з акопа, проста пад кулю, і адразу нежывым упаў. Адна хворая жанчына асталася ў хаце і разам з хатай згарэла.

Забітых немцаў хавалі нашы вяскоўцы — выкапалі яму і трупы басаком у яе цягалі. Я гэтага не бачыла і не ведаю, колькі было нямецкіх трупаў — я чула пра восем. Два ці тры гады таму тут шукалі тых немцаў, але не маглі трапіць, бо людзі забылі, дзе дакладна іх пахавалі, а след ніякі не астаўся. Я ў садку была бачыла аднаго забітага немца, ён апрануты быў, быў пры ім ягоны здымак з жонкай і двойкай дзяцей, Антон называўся, магчыма што са Шлёнска быў. Але я ягоных папераў не брала, бо мне і сваёй бяды хапала. Неўзабаве выйшла я глянуць што з мамай, і калі вярталася, зноў да таго нябожчыка заглянула, а ён ужо цалкам голы быў — невядома хто забраў ягоную вопратку... А тых двух пабітых саветаў нехта каля нашай хаты закапаў. Сын нейкі час таму капаў ямку і трапіў на два савецкія шлемы з чэрапамі, але закапаў гэта назад. А саветы па начах клікалі ратунку... На гасцінцы, што ў бок Дубровы, аднаго салдата раз'ехалі самаходамі так, што кішкі па дарозе валяліся. Аднаго немца, які падняў рукі ўверх, расстралялі савецкія разведчыкі і пасля таму немцу свінні галаву аб'елі...

Жыхары Гарасімавіч сталі капаць зямлянкі і ў іх жыць. А пасля некалькіх гадоў прыехалі ў вёску нейкія два савецкія чыны, склікалі ў нас сход каб нейкі помнік паставіць. Нехта сказаў, што найлепшым помнікам была б школа, і тыя рускія так запісалі. І так асталося. Некалькі разоў прыязджаў у нашу вёску, яшчэ ў старую школу, палкоўнік Пшыманоўскі (аўтар „Чатырох танкістаў і сабакі"), магчыма, што ён пахадайнічаў за новую школу. Пасля, недзе ў 1952-1954 годзе пабудавалі ў нас школу, але раней паставілі помнік, мо ў 1950 годзе. Не была гэта вясковая ініцыятыва, толькі польскіх улад. А якія там імпрэзы адбываліся! Мо з палова Польшчы сюды прыязджала, самаходаў процьма была — у той час, у канцы 1940-х гадоў! Спачатку гэтыя мерапрыемствы ладзілі каля помніка, з'язджаліся ўсе навакольныя школы, аркестр з Беластока прыязджаў... Бо тут за тыя два ваенныя дні столькі саветаў загінула, фурманкамі іх звозілі, толькі ногі віселі. А колькі яшчэ так па полі асталося! Я пайшла каня паглядзець, вяртаюся, бачу — пратаптаная сцежка. Я туды, а там ужо распухлы труп байца, а на ім поўна мух — я ледзь з духам адтуль уцякла; вельмі многа саветаў тут загінула, сама менш дзвесце чалавек.

Помнік Кунавіну каля Гарасімавіч

Мае размоўцы з сумам паведамілі, што ў гэтым годзе школа закрываецца, а бурмістр хоча прадаць школьны будынак. А людзі ў Гарасімавічах вельмі за лёс сваёй школы трывожацца.

Заглянуў я ў школу (было гэта ў пачатку чэрвеня), а там — ідылія. Усе залы адкрытыя, у настаўніцкім пакоі булачкі для дзяцей, заняткі на другім паверсе. У сенцах дзве вітрыны: у адной здымкі прысвечаныя памяці Грыгорыя Кунавіна, савецкага яфрэйтара, які загінуў каля Гарасімавіч і якога імя было прысвоена пасляваеннай школе. У другой вітрыне фотахроніка цяперашняга жыцця школы...

Прычакаў я перапынку, з'явілася настаўніца. Яшчэ пяць гадоў таму Кунавін быў патронам школы, але калі школа адышла пад грамадскае асветнае згуртаванне, тады асталася без патрона. Але дзеці апекаваліся магілай Кунавіна двойчы ў год: у пачатку і ў канцы навучальнага года. Залы памяці Кунавіна не было ўжо дваццаць гадоў таму, калі працу тут пачынала мая субяседніца. Прыязджаў на сустрэчы з дзяцьмі Вячаслаў Гаршкоў, жыхар падмаскоўскага Кліна, які ваяваў на Дуброўшчыне, але ўжо, мабыць, dziadek, як яго называлі дзеці, не прыедзе — апошні раз быў тут два гады таму. І школы, у якой у шасці класах ціха і бясстрэсава вучылася 15 вясковых дзетак, таксама ўжо не будзе, бо ў наш бурны час школы павінны выпускаць герояў...

На цяперашнім помніку Кунавіну, які стаіць каля кіламетра ад Гарасімавіч, віднее толькі ягонае прозвішча, а пра іншых байцоў — ні слова. На сайце Дубровы паведамляецца толькі, што там брацкая магіла. Раней там стаяў іншы помнік, у кшталце чатырохграннага абеліска, але той помнік, як я пазней даведаўся, знішчылі навакольныя хуліганы і на яго месца быў пастаўлены новы, мацнейшы. Агароджа там цяпер памаляваная, плошча перад помнікам выкладзена каменнымі і тратуарнымі пліткамі. І невядома, ці хто пахаваны там, ці не. Не хацелася мне вяртацца назад, таму за далейшай інфармацыяй падаўся я ў Хільмоны, да Уладзіміра Кудзіна. Мой суразмоўца сказаў, што каля помніка пахавана 23 байцоў, бо туды перапахавалі іх ад дарогі ў напрамку Дубасна, дзе было пахаваных таксама дзевяцярых немцаў; куды дзеліся апошнія — невядома. Я засумняваўся, бо ж жыхары Гарасімавіч гаварылі пра дзве сотні, а ў мінскім даведніку была згадка пра пяцьдзесят.

— Як справы маюцца ў сапраўднасці, будзе ведаць спадар Мазалеўскі з Дубровы, — адказаў мне Уладзімір Кудзін.

Пазваніў я спадару Мазалеўскаму. Ён мне сказаў, што не хоча называць ніякіх лікаў, бо можа яго падвесці памяць, але рэкамендаваў даведацца або ў аднаго з жыхароў Ячна, які цікавіўся гэтай справай, або ў парафіі ў Ружанастоку. Але найбольш верагодным палічыў ён, што каля помніка Кунавіну пахавана названых спадаром Кудзіным 23 байцоў. А апошнія байцы з той схваткі былі пахаваны ў іншых месцах і яны адтуль у пачатку 1950-х гадоў былі перапахаваны на брацкія могілкі ў Саколку.

Лікамі я ўжо далей не цікавіўся, мо яшчэ зраблю гэта пазней. Заглянуў я ў кірылічнае сеціва, дзе пра Кунавіна згадвае расійскі пісьменнік Юры Левін. Напісаў ён, што Кунавін быў пахаваны ў садочку Станіслаўчыка. Запытаў я спадара Мазалеўскага, ці так магло быць. У адказ пачуў я, што той садок належаў верагодна Кухарчыку або Савельеву. А на ўчастку Станіслаўчыка была, бадай, пабудавана школа.

Яшчэ прывяду вытрымку з 1932 года, цытаваную згаданым Левіным: „Кунавин Григорий Павлович награждается почетным званием ударника пятилетки, строителя социализма, активно проявившего себя в социалистическом соревновании по повышению производительности труда". У час вайны быў Кунавін парторгам роты. Цікава, ці калі б ён ім не быў, ведалі б мы пра яго больш чым пра апошнія сотні ананімных байцоў, якіх жыццё абарвалася 25 і 26 ліпеня 1944 года каля Крапіўна і Гарасімавіч...

Вярнуся яшчэ да інфармацый мінскага Міністэрства абароны. Калі б параўнаць адсотак праўды ў іх з адсоткам алкаголю ў спіртных напоях, тады мне падаецца, што кірылічная інфармацыйная вярхушка даволі цвяроза разглядае вынікі апошняй вайны. Каб ад праўды не разбалела галава...

Гарматы з Пагоняй над Віслай

Ян МОРДАНЬ

Выпадкова прыйшлося мне пабываць у невялікім, але даволі прываблівым мястэчку Баранаў-Сандамірскі, непадалёк ад Віслы, на поўдзень ад Тарнабжэга. Асабліва ўражвае рэнесансавы замак магнатаў Ляшчынскіх. І вось перад уваходам у гэты замак віднеюцца дзве шыкарныя гарматы, да таго ўсталяваныя на колах, надта знаёмых мне з дзяцінства. Разглядаючы даўнюю артылерыйскую зброю, убачыў я стройную Пагоню і на сэрцы з'явілася адчуванне гонару ды адначасова журбы. Чаму гэтыя гарматы апынуліся тут, каля палаца каралеўскіх Ляшчынскіх? Якія гістарычныя падзеі прывялі нашу Пагоню над Віслу? На гарматніх ствалах віднеюцца лацінскія літары: ANNO DNI MCXXXI. Што яны абазначаюць? Здавалася б, што сведчаць пра год вырабу, аднак вылітыя рымскія лічбы паказваюць лік 1131, а такая дата стварэння такой зброі безумоўна неверагодная.

Упершыню выкарыстанне артылерыі ў гісторыі запісана пад 1132 годам. Адбылося такое ў далёкім Кітаі, а дулы для стральбы былі бамбуковыя. І толькі ў II палове XIII ст. мусульмане сталі выкарыстоўваць гарматы (жалезныя і медныя трубы, якія стралялі каменнымі ды металічнымі ядрамі) у войнах з манголамі, а таксама ў Іспаніі. Праз заходнюю Еўропу гарматы даехалі і на нашы землі.

Ужо ў XIV ст. у войсках Вялікага княства Літоўскага сталі паяўляцца гарматы, запазычаныя ад крыжакоў. Свае гарматы пачалі вырабляць у XVI ст. у Вільні. Тут манарх Жыгімонт Аўгуст заснаваў людвізарню, дзе з медзі і бронзы вылівалісь палявыя і фартыфікацыйныя гарматы. Менавіта дзякуючы артылерыі ваяры Канстанціна Астрожскага у 1514 годзе пад Оршай перамаглі амаль утрая большае маскоўскае войска. У XVI ст. уся артылерыя ВКЛ была выдзелена ў асобны корпус і з гэтага часу на ўсіх гарматах пачалі выяўляць наш дзяржаўны герб Пагоню, а зброя Польскага каралеўства пазначалася выявай Арла. Непадалёк палаца ў Баранаве-Сандамірскім ёсць і гармата, на якой выліты гербавы Арол.

Апрача дзяржаўнай артылерыі ў нашай краіне была і прыватная. Такія магнаты як Радзівілы і Сапегі заснаўвалі свае людвізарні, дзе вылівалі гарматы, а потым размяшчалі іх у сваіх гарадах. Гарматы зробленыя на нашых землях знаходзяцца цяпер у розных месцах еўрапейскіх краін. Вось для прыкладу трапіла ў інтэрнэт такая цікавінка:

«Гарматы каля ўваходу ў Ваенны музей Варшавы. Былі прывезены сюды з Нясвіжа, адной з самых умацаваных фартэцый ВКЛ свайго часу. У XVII ст. у Нясвіжы налічвалася больш за 100 гармат. Прычым яны рэдка стаялі без справы.

Радзівілы перыядычна праводзілі сярод месцічаў конкурсы па стральбе з гарматаў і ружжаў, каб у выпадку небяспекі тыя маглі далучацца да гарнізона і стаць на абарону замка. Аднак магнацкая пыха не дазваляла Радзівілам мець проста гарматы, таму з-пад рук майстроў выходзілі вось такія творы мастацтва — з выявамі, малюнкамі і надпісамі. Кожная з гармат мела сваё імя і дэвіз.

Глядзіш на такі вось „смяротны шэдэўр" і думаеш, што раней людзі адносіліся да вайны (ці, прынамсі да яе атрыбутаў) больш творча, можна, нават, сказаць больш узнёсла. З часам практычнасць зброі поўнасцю выцесніла творчы элемент. І тут нават не скажаш, ці то гэта рэгрэс, ці то прагрэс?

А нясвіжскія гарматы так і стаяць пасярод танкаў і самалётаў, упрыгожваючы ўваход у музей».

І яшчэ адна інфармацыя, якая гэтай вясной з'явілася ў беларускіх масмедыях:

«У цэнтры Мінска знайшлі гарматы. Яны праляжалі ў зямлі амаль 200 гадоў. І заставаліся б там яшчэ доўга, калі б не рэканструкцыя будынка па вуліцы Інтэрнацыянальнай, 3. У катлаване, на глыбіні ў чатыры метры, экскаватар зачапіў каўшом велізарныя старадаўнія гарматы.

— Дасталі, ачысцілі — і вачам сваім не паверылі: старадаўняя гармата, як у фільмах пра Аўстэрліц паказваюць. Праз паўгадзіны побач знайшлі яшчэ адну, акурат такую ж, — не хавае здзіўлення ў інтэрв'ю газеце „Рэспубліка" Андрэй Карэкаў, галоўны інжынер ТДА „Вайсковец" (падрадчык працаў). — Увогуле, мы займаемся перапрафіляваннем недабудаванага гатэльнага комплексу пад бізнэс-цэнтр з паркінгам. Не так даўно метадам лакальнага выбуху тут падарвалі бамбасховішча, якое будавалі яшчэ палонныя немцы. Відаць, ад гэтага зрушыўся нейкі стары пласт зямлі, пад якім ляжалі гарматы. Каб вывезці іх адсюль, спатрэбіцца адмысловая машына і кран: вага кожнай — пад 400 кілаграмаў.

Гісторыкі пакуль не могуць вызначыць краіну — вытворцу ладунку: што не Францыя і не Расія — дакладна. Астатняе стане вядома пасля сканчэння дэталёвай экспертызы.

— Гэта вялікая рэдкасць і велізарны поспех: у беларускіх музейных экспазіцыях сёння не набярэцца і трох дзесяткаў старадаўніх гармат. Таму кожная штука такога ладунку выклікае цікавасць і мае вялікую гістарычную каштоўнасць, — кажа Зміцер Шляхцін, старэйшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. — Сёння можна з пэўнасцю сцвярджаць, што гэта 6-фунтавыя палявыя гарматы XVIII стагоддзя. Яны стралялі на 2-2,5 кіламетры суцэльналітымі ядрамі, разрыўнымі гранатамі і карцеччу. У Мінску нічога падобнага не знаходзілі ўжо вельмі даўно».

Так, што нямнога даўніх гармат асталося ў Беларусі, не кажучы пра наша Падляшша. Можа сваю спадчыну і ў сучасным свеце трэба абараняць менавіта гістарычнай зброяй, а да таго варта пераадольваць «шэнгенскія» межы.

А гады ідуць...

І не здаецца тым хто знае Гандзю Стахіюк з Трасцянкі, што гэтай жанчыне ўжо столькі гадоў. Заўсёды высокая, статная, простая, дужая жанчына з праніклівымі чорнымі вачамі зачароўвала сваёй прыгажосцю і сваім голасам!

Нарадзілася Гандзя пры канцы снежня 1922 г., але тады была такая мода, што бацькі запісвалі такіх дзяцей на студзень наступнага. Так было і з Аннай.

Ганна Стахіюк

Гадавалася ў мнагадзетнай сям'і Якаўчукоў з самымі дзяўчаткамі. Яна была самая старэйшая. Дзве памерлі малымі, а ўсе чатыры сёстры жывуць дагэтуль. Так як усе дзеці ў міжваенны час хадзілі ў мясцовую школу і памагалі бацькам у гаспадарцы. Як прыйшлі саветы, Анна вучылася ў чыгуначнай школе ў Беластоку. Была гэта аднагадовая школа для моладзі. Пару разоў толькі паехала ў экспедыцыю і пачалася вайна. Дзяўчыну вайна заспела ў Вільні. Дахаты ў Трасцянку дабіралася пехатой. Ішла з адным яўрэем з Беластока. Тых, хто ішоў на захад, немцы прапускалі. І за два тыдні вандроўкі дабралася Анна ў сваю Трасцянку.

У 1942 годзе прыгажуня Гандзя выйшла замуж за аднавяскоўца Валодзю Стахіюка. Але і гэта не выратавала ад прымусовых работ. Спачатку забралі мужа, а затым і жонку. Жанчына трапіла ў маёнтак Кіршляйнен ля Вартэнбурга. Гаспадар называўся Красько. Быў вельмі добрым чалавекам.

— У гэтым маёнтку не прыйшлося быць доўга, бо я была цяжарная. Памог мне выйсці з гэтых Прус хлопец-парабак, чэх па нацыянальнасці. Ён меў знаёмых у арбайтсамце, пайшоў туды са мною і мяне звольнілі. Я вярнулася дахаты і хутка нарадзіла сына Толіка. То быў ужо 1943 год. Праз год прайшоў фронт, шчасліва вярнуўся мой муж Валодзя і ў 1945 г. нарадзілася ў нас дачушка Валя. У 1947 г. прыйшоў на свет сын Віця, а затым Вася і Генік.

Сям'я абрабляла невялікую гаспадарку, дзеці падраслі і вучыліся. Гаспадар пайшоў падзарабляць у мясцовай цагельні, а сама Гандзя мела многа работы дома. Дзеці падраслі, то ўладкавалася прыбіральшчыцай у школе. У той час, у шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады, спадарыня Анна многа свайго часу аддавала мясцоваму гуртку БГКТ — і спявала, і выступала як здольная акцёрка ў драмгуртку. Ездзіла выступаць на конкурсы песні, займаючы перадавыя месцы.

Спяваць Анна пачала ў царкоўным хоры з дванаццацігадовага ўзросту. Была харысткай увесь час. А калі памёр мясцовы дзячок Васілюк, Гандзя Стахіюк доўгія гады кіравала царкоўным хорам, а потым перадала палачку Олі Сіманчук, таксама мясцовай харыстцы малодшага пакалення.

Гады бягуць... Даўно няма мужа Валодзі — ужо 15 гадоў. Памерлі два сыны — найстарэйшы і наймалодшы. Іншыя дзеці па гарадах... Валя ў Гайнаўцы, Віця і Вася ў Беластоку. Але не забываюць пра родную Трасцянку... Ужо і ўнукі разбегліся па свеце...

А бабуля ўсё ў сваёй хаце і на сваім невялікім агародчыку, бо сілы ўжо не тыя. А то сабе на лавачцы пасядзіць летам з суседкамі, якіх робіцца штораз менш. Добра, што Віця часта ў Трасцянцы, то маму падвязе ў царкву, бо далекавата было б ісці...

І так хутка гады бягуць, а мне здаецца, што Гандзя Стахеева, як яе ў вёсцы завуць, зусім не старэецца і як заўсёды пры сустрэчы ўмее яшчэ добра пажартаваць, прыгожа ўсміхнуўшыся...

РУТА